

МУЗЕЙ — УСЁ ІХ ЖЫЦЦЁ

6

ЭКСКУРСАВОД ПА ... МОГІЛКАХ

19



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

22 КАСТРЫЧНІКА 2021 г.
ПЯТНІЦА
№ 204 (29573)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
+TV ПРАГРАМА
Газета для выбаршчыкаў і дэпутатаў мясцовых Саветаў

## КОРАТКА

• **У НАН Беларусі распрацавалі і асвоілі вытворчасць экспрэс-тэстаў на COVID-19.**

• Беларуска-кітайскі маладзёжны форум «Новыя гарызонты» пройдзе ў Мінску 11—12 лістапада.

• **Паблізу ўрочышча Уручча ў Мінску пачаліся раскопкі раней не ўстаноўленага пахавання часоў Вялікай Айчыннай вайны.**

• Беларусы ў студзені—верасні ўсынавілі 277 дзяцей.

• **МТЗ адкрыў фірмовы навучальны цэнтр у Стаўрапальскім аграрным універсітэце.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Раман ГАЛОЎЧАНКА, прэм'ер-міністр**

*«Уся беларуская зямля — помнік тых злачынстваў, якія ўчынялі захопнікі на нашай тэрыторыі. Работа па ўстанаўленні месцаў пахаванняў часоў вайны актывізавалася ў рамках распачатай Генеральнай пракуратурай крымінальнай справы па факце генацыду беларускага народа. За кароткі перыяд часу, пачынаючы з лета, ужо зроблена вялікая работа і выкрываюцца ўсё новыя страшныя падзеі тых дзён. Гэтая работа будзе працягвацца да таго часу, пакуль не будуць устаноўлены ўсе месцы расправ над мірным насельніцтвам і ваеннапалоннымі на тэрыторыі нашай краіны. У будучыні ўсе месцы, якія да гэтага часу былі невядомыя, будуць мемарыялізаваны, будзе ўвекавечана памяць ахвяр, якія там загінулі».*

З першых вуснаў

# «Не дапусціць разбалансаванасці сістэмы органаў дзяржаўнай улады»

**Прэзідэнт Беларусі сустрэўся ўчора з рабочай групай, створанай для дапрацоўкі новай рэдакцыі Канстытуцыі. У яе склад увайшлі 11 чалавек — парламентарыі, кіраўнікі некаторых органаў улады, суддзі, прадстаўнікі навуковай і грамадзянскай супольнасцяў. Група зоймецца вырашэннем пытанняў, па якіх не прыйшоў да адзінага меркавання шырокі склад Канстытуцыйнай камісіі. А менавіта: статус Усебеларускага народнага сходу і парадак яго фарміравання, пераразмеркаванне кадравых і кантрольных паўнамоцтваў паміж органамі ўлады, тэрмін паўнамоцтваў Прэзідэнта, Нацыянальнага сходу, мясцовых Саветаў дэпутатаў і некаторыя іншыя пытанні. Вынікам дзейнасці групы стане праект Асноўнага Закона, які разгледзіць Канстытуцыйная камісія і абмяркуе грамадства. На апошнім этапе яго дашліфуюць спецыялісты для вынясення на рэферэндум. Плануецца, што Канстытуцыя будзе прадстаўлена на ўсенароднае абмеркаванне ў снежні.**

СТАР. 2



Фота БелТА.

На слыху

# ФІШЫНГ, ВІШЫНГ — ДВА КІТЫ КІБЕРЗЛАЧЫННАСЦІ,

## або Як абараніцца ад махляроў у сферы сучасных тэхналогій

**Інфармацыйнае махлярства — біч XXI стагоддзя. Па розных ужо адпрацаваных схемах дзейнічаюць сотні злачынцаў па ўсёй краіне. Сёння мы паспрабуем высветліць, як выманьваюць грошы ў звычайных людзей сучасныя аферысты.**



Мінчанка ўстанавіла праграму аддаленага доступу і страціла больш за 12 тысяч рублёў — пра гэта распавяла **афіцыйны прадстаўнік УСК горада Мінска Кацярына ГАРЛІНСКАЯ.**

Сёлета ў Мінску зноў расце колькасць злачынстваў у сферы інфармацыйных тэхналогій. Пераважную большасць з іх складаюць крадзяжы грашовых сродкаў шляхам завалодання рэквізітамі банкаўскіх картак — арт. 212 (крадзеж маёмасці шляхам мадыфікацыі камп'ютарнай інфармацыі) КК.

За 8 месяцаў сталічныя падраздзяленні распачалі 2969 крымінальных спраў па гэтым артыкуле. Для параўнання: за аналагічны перыяд 2020 года — 2244 падобныя злачынствы.

Па даных следства, праз месенджар Viber 42-гадовай жанчыне патэлефанаваў невядомы і прадставіўся працаўніком юрыдычнага аддзела асацыяцыі банкаў. Падчас званка на экране адлюстраваўся лагатып аднаго з найбуйнейшых беларускіх банкаў краіны з надпісам «Падтрымка». Суразмоўца паведаміў мінчанцы, што ад яе імя адкрыта некалькі крэдытных дагавораў і каб іх закрыць, неабходна здзейсніць некалькі дзеянняў пад яго кіраўніцтвам.

СТАР. 5

Журналісцкае расследаванне

# ШТО З ДАРОГАЙ ДА ВЫСТАЎКІ...

**Даўно планаваў зрабіць з вёскі пад назвай Выстаўка рэпартаж, але не думаў, што ён атрымаецца праблемны. Хацелася высветліць гісторыю назвы: ці ёсць там мастакі, мо праводзяць пленэры, мо звязана з назвай прыгожая легенда? Але... вяскоўцы самі паклікалі журналіста да сябе, каб рэдакцыя дапамагла ў пытанні рамонту дарогі, якая вядзе да Выстаўкі.**

### На вуліцы Сонечнай

Дарэчы, гэтую дарогу можна назваць дарогай жыцця, бо ў вёсцы, як высветлілася на месцы, няма крамы, пошты, амбулаторыі і іншых сацыяльна важных аб'ектаў.

Аўтобус прыязджае ў Выстаўку тры разы на тыдзень: у аўторак, суботу і нядзелю. Інтэрнэт працуе не надзейна, ды і якасць мабільнай сувязі пакідае жадаць лепшага.

СТАР. 4



Фота Аляксандра ПУКШАНСКАГА.

ISSN 1990 — 763X
21204
9 771990 763008

# «Не дапусціць разбалансаванасці сістэмы органаў дзяржаўнай улады»

## Праект Асноўнага Закона

Аляксандр Лукашэнка нагадаў: зусім нядаўна дамовіліся, што, калі створаная рабочая група скончыць разам з кіраўніком краіны напісанне Канстытуцыі, варыянт дакумента будзе ўнесены на пасяджэнне Канстытуцыйнай камісіі і на рэферэндум.

«Таму мы прыступаем да работы на этапе — стварэнне праекта Канстытуцыі. Задача гэтай групы — працягнуць пачатую Канстытуцыйнай камісіяй дзейнасць. Зразумела, што тут сабраліся «дзяржаўнікі» і кіраўнікі са стажам. Вопытныя людзі розных прафесій павінны фарміраваць аблічча новай Канстытуцыі. Нашы прапановы юрысты, спецыялісты афармяць у новы праект Канстытуцыі. То-бок, прапішуць мовай юрыдычнай», — сказаў Прэзідэнт на нарадзе.

Па словах кіраўніка краіны, задача групы — вызначыцца і прапанаваць Канстытуцыйнай камісіі і грамадству варыянты будучай Канстытуцыі ў асноўных момантах. Аляксандр Лукашэнка адзначае, што па статусе і вопыце кіруючай работы на высокіх пасадах члены рабочай групы глыбока разумеюць сэнс змяненняў Асноўнага Закона, іх абгрунтаванасць, перспектыўнасць для развіцця дзяржаўнасці і абароны нацыянальных інтарэсаў.

У першую чаргу рабочая група засяродзіцца на шэрагу нявырашаных пытанняў, сцвярджае кіраўнік краіны. Па яго словах, такіх нямала, і трэба іх дэталёва абмеркаваць у канструктыўным ключы, знайсці самыя аптымальныя рашэнні. «Калі ў працэсе работы ўбачыце, што нейкія палажэнні патрабуюць дашліфоўкі, таксама прапаноўвайце свае падыходы. ***Галоўнае ў працы гэтай рабочай групы над канстытуцыйнымі змяненнямі — не дапусціць разбалансаванасці сістэмы органаў дзяржаўнай улады. Важна пазбегнуць змяшэння функцый і паўнамоцтваў ключавых органаў улады, забяспечыць узгодненасць іх дзеянняў»***, — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Асаблівую ўвагу ён просіць удзяляць новаму органу — Усебеларускаму народнаму сходу, статус, парадак фарміравання, кампетэнцыі якога належыць вызначыць. Аляксандр Лукашэнка загадвае зрабіць гэта так, каб не парушыць устойлівасць дзяржаўнага апарату, не дапусціць з'яўлення двоеўладдзя.

«Лічу, што рабочая група павінна ўзяць добры старт з самага пачатку. Часу на раскачку абсалютна няма, будзем працаваць аператыўна. Вынікам дзейнасці групы стане праект Асноўнага Закона, які абмяркуем з Канстытуцыйнай камісіяй і ўнясём для ўсенароднага абмеркавання. Потым, пасля ўсенароднага абмеркавання, дашліфуем, і праект пойдзе на рэферэндум», — пералічыў этапы кіраўнік краіны.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

### «Сённяшняя Канстытуцыя дакладна пад Прэзідэнта»

Прэзідэнт прапанаваў працу групы звесці ў Адміністрацыю Прэзідэнта, а яе кіраўнік Ігар Сергеенка будзе на чале і рабочай групы.

Кіраўнік краіны звярнуў увагу на яшчэ адзін момант. Прадстаўнікі апазіцыйных сіл сцвярджаюць, што рэферэндум і новую Канстытуцыю робіць Аляксандр Лукашэнка пад сябе. Ён адмаўляе гэтыя выказванні, параўноўваючы будучы праект Асноўнага Закона з дзеючай Канстытуцыяй. «Калі шчыра казаць, то сённяшняя Канстытуцыя дакладна пад Прэзідэнта. І лепшай Канстытуцыі па іх крытэрыях ніякаму Прэзідэнту не трэба. Гэта Канстытуцыя, сапраўды, вельмі жорсткая. Многія спецыялісты кажуць, што і аўтарытарнага характару ў нас улада з прычыны гэтай Канстытуцыі. Гэта так. І мы кажам, чаму мы рабілі гэтую Канстытуцыю такім чынам і пад Прэзідэнта. Таму любая іншая Канстытуцыя будзе слабейшай, чытай, як яны кажуць, «дэмакратычнейшай» за сённяшнюю Канстытуцыю. Таму папракаць мяне, што Прэзідэнт робіць пад сябе Канстытуцыю, — поўнае глупства», — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка.

Паводле яго слоў, прыйшоў час Канстытуцыю зрабіць такім чынам, каб паўнамоцтвы органаў улады і кіравання былі размеркаваны, але краіна засталася прэзідэнцкай рэспублікай. Аляксандр Лукашэнка канстатуе: больш за 90 % людзей лічаць, што Беларусь павінна быць з такой формай кіравання.

«Мы яшчэ напярэдадні рэферэндуму. Я вам скажу, што толькі два-тры працэнты застанецца тых, што будуць крычаць: нам неабходна нейкая іншая рэспубліка — не прэзідэнцкая, а парламенцкая ці прэзідэнцка-парламенцкая і гэтак далей. ***Абсалютна ўпэўнены, што Беларусь павінна быць прэзідэнцкай рэспублікай, калі мы хочам захаваць краіну***. І Усебеларускі народны сход уводзіцца не таму, што нехта з прысутных, дзеючы Прэзідэнт ірвецца на гэтую пасаду, а для таго, каб забяспечыць (як кажуць юрысты) стымуляванне і процівагу», — падкрэсліў кіраўнік краіны, адзначыўшы, што гэтыя паняцці — фундаментальныя рэчы. На іх будуюцца ўсе заканадаўчыя акты і перад усім Асноўны Закон.

«Што б мы тут ні рабілі — для іх (апазіцыйных сіл. — **«Зв.»**) чым горш, тым лепш. Нам трэба чуць гэтыя галасы, і мы будзем іх чуць, хочам таго ці не. Але калі рэагаваць на кожнае «чханне» з-за межаў нашай краіны людзей, што адпрацоўваюць узятыя ў амерыканцаў, немцаў грошы, седзячы ў Польшчы ці Літве, тады мы перастанем працаваць і клапаціцца пра ўласны народ. І ні ковід, ні санкцыі — ніводнага пытання тады не вырашым», — заяўляе Аляксандр Лукашэнка.

Ён дадае, што асабіста гатовы актыўна ўключацца ў працу, але жадае прапаноў з боку членаў рабочай групы па шырокім коле пытанняў сустрэчы.

***«Мы заўсёды павінны памятаць, што любы наш крок можа разбурыць краіну»***. Вы бачыце, як людзі прывыклі: калі Прэзідэнт кожны дзень не сказаў якое-небудзь слова, тады «дзе ён?» Гэта не толькі таму, што мы прывучылі людзей да гэтага, а таму, што нашы людзі такія. І, дзякуй богу, яны добрыя, сумленныя, звыкла арыентавацца на спецыялістаў, вельмі адукаваныя», — кажа Прэзідэнт.

Ён заяўляе, што не ў яго кампетэнцыях вучыць вопытных, аўтарытэтных членаў рабочай групы, якой павінна быць краіна, бо многія з іх разам з Прэзідэнтам стваралі дзяржаву.

«Таму давайце прапануем варыянт (Асноўнага Закона. — **«Зв.»**) Канстытуцыйнай камісіі і потым людзям розных узростаў, памкненняў, прафесій, каб яны зразумелі: гэта іх Канстытуцыя», — рэзюмуе Аляксандр Лукашэнка.

**Марыя ДАДАЛКА.**

### Каментарый у тэму

Як расказаў **кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар СЕРГЕЕНКА**, якому даручана ўзначальваць рабочую групу па дапрацоўцы Канстытуцыі, работа будзе штодзённая, у ёй задзейнічаюць таксама прадстаўнікоў разнастайных структур, экспертную супольнасць.

«Сёння абмяркоўваліся канкрэтныя кірункі дзейнасці рабочай групы. У тым ліку па статусе Усебеларускага народнага сходу, паўнамоцтвах органаў, па іншых палажэннях, што закранаюць разнастайныя сферы жыццядзейнасці нашай краіны. Работа мае быць скрупулёзная, напружаная, таму што па Канстытуцыі жыць дзесяцігоддзі», — сказаў Ігар Сергеенка.

Па яго словах, група павінна скончыць сваю работу на працягу месяца, а ўжо да снежня праект Канстытуцыі вынесуць на ўсенароднае абмеркаванне.

«Гэта сур'ёзны дакумент, эпахальны, з якім бы сказаў, на значны перыяд гісторыі. Неабходна далей глядзець, як ён будзе працаваць, якія ў нас рызыкі і пагрозы сёння, якія будуць заўтра. Не проста напісаць юрыдычныя фармулёўкі — неабходна ўлічваць вопыт мінулых пакаленняў, нешта спрагназаваць. Работа сур'ёзная», — заявіў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта.

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Кіраўнік вядучай фракцыі Еўрапарламента папярэдзіў аб магчымым выхадзе Польшчы з ЕС

**Манфрэд Вэбер, кіраўнік вядучай фракцыі Еўрапарламента — Еўрапейскай народнай партыі (ЕНП), папярэдзіў аб магчымым выхадзе Польшчы са складу Еўрапейскага саюза на фоне спрэчкі Бруселя і Варшавы пра прыярытэт еўрапейскага заканадаўства над дзяржаўным, паведамляе ТАСС.**

Палітык адзначыў, што на саміце Еўрасавета, які мае адбыцца, неабходна знайсці кампраміснае рашэнне адносна прававой спрэчкі паміж Польшчай і ЕС. «Гаворка ідзе аб прынцыповым пытанні, якое заключаецца ў тым, ці прымае ЕС права і незалежнасць правасуддзя. Тое, што гэтая тэма да гэтага часу не абмяркоўвалася, з'яўляецца правалам Еўрапейскага савета», — сцвярджаў кіраўнік ЕНП.

Пры гэтым ён дадаў, што Еўрасавету не варта баяцца рэальных дэбатаў, якія неабходна весці ў Еўропе. «Калі пытанне вяршэнства закона і дзеяння норм еўрапейскага права не будзе вырашана, то існуе рызыка вымушанага выхаду Польшчы з ЕС праз чорны ход», — сказаў на заканчэнне Манфрэд Вэбер.

Канстытуцыйны суд Польшчы 7 кастрычніка, разгледзеўшы запыт прэм'ер-міністра Матэўша Маравецкага, пацвердзіў неадпаведнасць нормы аб дамінаванні еўрапейскага права над палажэннямі Канстытуцыі. Гэтае рашэнне выклікала новую хвалю крытыкі з боку Бруселя і дыскусію аб магчымасці пазбаўлення Варшавы сродкаў з еўрапейскіх фондаў.

### У Латвіі для парушальнікаў антыковідных мер прадугледжаны штрафы да дзвюх тысяч еўра

**За невыкананне асабліва строгіх абмежаванняў, якія дзейнічаюць на тэрыторыі Латвіі ў перыяд локдаўну, для фізічных асоб прадугледжаны штрафы да дзвюх тысяч еўра, паведамляе Delfi.**

Нарматыўнымі актамі прадугледжана, што фізічная асоба, якая парушыла ўведзеныя абмежаванні, якія датычацца COVID-19, можа быць аштрафавана ў адміністрацыйным парадку на суму ад 10 да 2 тысяч еўра, а юрыдычная асоба — на суму ад 140 да 5 тысяч еўра.

18 кастрычніка на пасяджэнні Савета па крызісным кіраванні Латвіі было прынята рашэнне ўвесці ў краіне жорсткі лакдаўн на чатыры тыдні для абмежавання распаўсюджвання каранавіруса. У гэты перыяд у Латвіі таксама будзе дзейнічаць каменданцкая гадзіна з 20.00 да 5.00.

Акцэнты

# БЯСПЕКІ ШМАТ НЕ БЫВАЕ

### Але добра, што ў гэты складаны час не зачыняюцца храмы

**У апараце Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў адбылося пасяджэнне Кансультацыйнай міжканфесійнай рады, дзе цэнтральнай тэмай стала санітарна-эпідэміялагічная сітуацыя ў краіне. Прадстаўнікі розных канфесій разам са спецыялістамі ў прыватнасці пагаварылі пра вакцынацыю, асабліва новай хвалі хваробы...**

— Калі я бываю ў раёнах і праводжу сустрэчы са святарамі розных аб'яднанняў, то чую пытанні і заўсёды імкнуся знаходзіць шляхі іх вырашэння, — адзначыў на пачатку сустрэчы **Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Аляксандр РУМАК.** — Сёння, безумоўна, самае актуальнае пытанне для ўсіх людзей у нашым грамадстве — гэта тое, што звязана з каранавірусам і санітарна-эпідэміялагічнай сітуацыяй у краіне. Каб не ўзнікла сітуацыі, калі нам давядзецца зачыняць храмы, як гэта ўжо адбываецца ў некаторых краінах, мы звяртаемся да вас і просім вашага садзейнічання ў нашай агульнай рабоце па зберажэнні чалавечых жыццяў.

Інфармацыю пра стан санітарна-эпідэміялагічнай сітуацыі ў краіне агучвалі на сустрэчы спецыялісты санітарна-эпідэміялагічнай службы і **першы намеснік міністра аховы здароўя Алена БОГДАН.** Яна расказала пра асаблівасці таго, як працякае захваральнасць на каранавірус зараз, і заклікала да аб'яднання намаганняў у тым, каб даносіць праўдзівую інфармацыю да насельніцтва і пераконваць свядома клапаціцца пра ўласнае здароўе.

— Вірус змяніўся. Ён таксама хоча жыць. І чым больш мы з ім ваюем і лечым людзей, тым больш ён імкнецца выжыць. Прадбачыць, які будзе ў яго наступнік, ніхто не можа, — адзначыла Алена Богдан. — Асаблівасць цяперашняй хвалі ў тым, што хварэе маладое насельніцтва. Калі ў першую хвалю сярод дзяцей былі адзінкі захварэлых і мы назіралі ў іх найцяжэйшыя мультысістэмныя сімптомы, калі ў дзіцяці пачыналі адмаўляць абсалютна ўсе органы, то зараз гэтага няма. Але дзеці хварэюць на пнеўманію і ім патрабуецца кіслародная падтрымка... Таму сёння важна выконваць санітарна-эпідэміялагічнага рэжыму. Асабліва важна яго прытрымлівацца ў памяшканнях — крамах, культурных і культавых установах, грамадскім транспарце. Усюды, дзе людзі збіраюцца ў вялікай колькасці.

Спікер адзначае, што людзі прыходзяць у храмы, пакланяюцца іконам, прыкладваюцца да іх, і, што б ні гаварылі, яны будуць так рабіць, бо вераць.

— Наша задача, каб побач быў той, хто пратрэ ікону, каб былі створаны ўмовы для прадухілення небяспекі. Масачны рэжым патрэбны, але маска павінна быць чыстай. І наступнае — гэта вакцынацыя, — сказала першы намеснік міністра. — Перш за ўсё я хачу звярнуцца да тых прадстаўнікоў рэлігійных аб'яднанняў, дзе ў нас ёсць манастыры. Гэта асабістая справа кожнага, як ставіцца да ўласнага здароўя, але давайце абаронім людзей. Мы гатовы прышчапіць іх. Акрамя вакцынацыі, нас нічога не ўратуе.

Яна таксама распавяла, што зараз сітуацыя з захваральнасцю на каранавірус характарызуецца складаным працяканнем хваробы: «Колькасць пнеўманій па краіне ніжэйшая, чым была летась. Але пнеўманій, якія знаходзяцца ў стацыянарах, у разы больш. Мы павялічылі колькасць кіслародных пунктаў з 8000 да 22 000. Мы выдаткоўваем 210—220 тон кіслароду ў суткі, што таксама гаворыць пра цяжкае цячэнне захворвання. Пры гэтым прышчэпленых пацыентаў у стацыянары не больш за 4 %. Чалавек і з прышчэпкай можа захварэць, але гэта не прывядзе да летальнага зыходу».

— У розныя часы наша краіна і людзі сутыкаліся з разнастайнымі праблемамі, спакусамі. І гэта чарговы складаны этап для нашай Айчыны, які мы разам абавязкова пераадолеем. Але толькі пры ўмове, што згуртуемся, не будзем панікаваць і станем клапаціцца адно пра аднаго, — кажа **архіепіскап Гродзенскі і Ваўкавыскі Антоній.** — Важна, што ў гэты час не зачыняюцца храмы. Бо там чалавек можа знайсці супакаенне і звярнуцца да Бога з малітвай. Зараз ужо два гады як каранавірусная інфекцыя існуе і не ўспрымаецца як нейкая надуманая гісторыя, бо ў кожнай сям'і сутыкнуліся з гэтай хваробай. Нашы прыхаджане вельмі адказна ставяцца да гэтага, а мы заўсёды кажам, што калі чалавек не клапоціцца пра ўласнае здароўе, то яму варта падумаць пра блізкіх. Бо, калі па нашай віне захварэе іншы чалавек, гэта грэх, з якім нам давядзецца жыць.

Вядома, кожны з нас перш за ўсё ў адказе за ўласнае здароўе і заўтрашні дзень. Але часам варта нагадваць аб прапісных ісцінах, каб не было сумных наступстваў. На іх прадухіленне было накіравана і абмеркаванне шэрагу іншых актуальных тэм, сярод якіх перспектывы супрацоўніцтва Беларускага саюза жанчын з рэлігійнымі аб'яднаннямі; арганізацыя ахоўных мерапрыемстваў культурных збудаванняў; дзяржаўная рэгістрацыя рэлігійнымі арганізацыямі нерухомай маёмасці і зямельных адносін; правядзенне рамонтных і рэстаўрацыйных работ у культавых пабудовах, якія маюць статус гісторыка-культурнай каштоўнасці.

**Алена ДРАПКО.**

Кантэкст

# ПАКУТЫ НА ГРАНІЦЫ

**Зверствы на граніцы працягваюцца, прычым шакавальныя звесткі датычацца як польскіх, так і літоўскіх сілавікоў.**

Як паведаміў Дзяржпагранкамітэт, напрыканцы мінулага тыдня на лініі граніцы беларускі пагранічны нарад выявіў групу бежанцаў. «На польскай тэрыторыі паблізу загароды былі зафіксаваны сляды, якія прама сведчылі аб тым, што групу выпхнулі сілай, — заўважылі ў ведамстве. — Замежнікі расказалі, што польскія сілавікі прывезлі іх і гвалтоўна выціснулі праз загароду, усталяваную на польскім баку, нягледзячы на тое, што адзін з іх быў практычна без адзення, прамок, замёрз і меў патрэбу ў медыцынскай дапамозе. Мужчына знаходзіўся ў непрытомным стане. Бежанцы прасілі не пакідаць іх і аказаць дапамогу, але польскія вайскоўцы чарговы раз проста пакінулі людзей у заведама небяспечным становішчы. Каб выратаваць бежанца, беларускі пагранічны нарад выклікаў брыгаду хуткай медыцынскай дапамогі, якая даставіла мужчыну ў медустанову».

Днямі беларускія пагранічнікі выявілі групу бежанцаў на лініі літоўска-беларускай граніцы. «Некаторыя з іх змерзлі і настолькі былі знясіленыя, што ляжалі на халоднай зямлі. На працягу ўсяго гэтага часу на сумежным баку знаходзіліся літоўскія вайскоўцы. Замежнікі распавялі, што ў адказ на заяўленае хадайніцтва аб наданні статусу бежанца літоўскі бок запрасіў іх прайсці ў глыб Літоўскай Рэспублікі. Ужо на месцы ў іх адабралі грошы і дакументы, збівалі, абражалі, прымянялі электрашокер, адмаўлялі ў ежы і вадзе, разбілі тэлефоны ў тых, хто не паспеў схаваць, — заўважылі ў Дзяржпагранкамітэце. — Пасля літоўскія сілавікі прывезлі 11 чалавек — грамадзян Судана, Емена, Ірана, Нігерыі і Малі — на лінію граніцы і паспрабавалі выпхнуць на беларускую тэрыторыю».

Бежанцы таксама расказалі, што літоўскія вайскоўцы разбівалі іх тэлефоны, каб фота- і відэаматэрыялы, якія захоўваліся на прыладах, не былі перададзены журналістам і міжнародным арганізацыям. «Публічная агалоска супрацьзаконных спосабаў і метадаў абыходжання з бежанцамі не выгадная ні Літве, ні Польшчы, ні Латвіі», — адзначылі ў ведамстве.

Бежанцы з Афганістана, якія жывуць на лініі граніцы з польскага боку ўжо больш за два месяцы, стаміўшыся ад бяздзейнасці і абыякавасці польскіх улад, нечалавечых умоў, адсутнасці перспектыў атрымання адказу на просьбы аб атрыманні прытулку ў Польшчы, зрабілі крок адчаю. «Усвядоміўшы, што польскі бок насамрэч не разглядае пададзеныя імі прашэнні і ў далейшым будзе абыякава назіраць за іх пакутамі, не зрабіўшы ніякіх дзеянняў для вырашэння сітуацыі, частка афганцаў паспрабавала пераадолець небяспечныя загароды», — адзначылі ў Дзяржпагранкамітэце.

У выніку афганцы былі жорстка збітыя і затрыманыя польскімі сілавікамі з выкарыстаннем пярцовага газу. «Пасля паўгадзіны бежанцы, у тым ліку жанчыны і дзеці, пад рулямі аўтаматаў правялі лежачы на халоднай і сырой зямлі, былі ў кайданках вывезеныя ў глыб Польшчы.

«Падобныя дзеянні з'яўляюцца сігналам для міжнароднай грамадскасці звярнуць увагу на тое, што на самай справе адбываецца з замежнікамі на польскай тэрыторыі. Асабліва пасля таго, як Польшча перастала пускаць прадстаўнікоў СМІ і праваабарончых арганізацый у памежную тэрыторыю і пачала старанна хаваць ад сваіх грамадзян праўду, замоўчваючы існаванне стыхійнага лагера афганцаў на іх тэрыторыі. Нагадаем, што гэтыя афганскія бежанцы былі затрыманыя ў розных частках Польшчы і вывезены польскімі сілавікамі на граніцу яшчэ ў жніўні, — заўважылі ў ведамстве. — Афганцы падалі прашэнні аб атрыманні абароны. Дакументы замежнікаў знаходзяцца ў Польшчы. Яны перадалі іх сваім законным прадстаўнікам, якія неаднаразова звярталіся да польскіх улад з просьбай вырашыць гэтую праблему. Таксама на неабходнасць аказання дапамогі групе афганскіх бежанцаў неаднаразова звярталі ўвагу ААН і ЕСПЧ, а таксама праваабарончая арганізацыя Amnesty International. Пры гэтым прадстаўнікамі міжнародных праваабарончых арганізацый неаднаразова адзначалася, што прымусовая высылка людзей, якія шукаюць прытулку, супярэчыць еўрапейскаму і міжнароднаму заканадаўству».

Перасячэнне граніцы — наладжаны міжнародны злачынны бізнес. Польскія пагранічнікі затрымалі шасцярых замежнікаў — двух грамадзян Украіны, грамадзяніна Турцыі, грамадзяніна Германіі, грамадзяніна Ірака і грамадзяніна Лівана, якія дапамагалі нелегальным мігрантам перасякаць граніцу, паведаміў тэлеканал TVP Info. Як паведамлялася, 18 кастрычніка ў Польшчы быў затрыманы грамадзянін Украіны, які перавозіў на грузавым аўтамабілі, што належыць папулярнай кур'ерскай кампаніі, 27 нелегальных мігрантаў з Ірака.

Тым часам стала вядома пра смерць мігранта. Цела 19-гадовага бежанца-сірыйца было знойдзена польскімі вадалазамі ў рацэ Буг на польска-беларускай граніцы, паведаміў журналістам прэс-сакратар Люблінскай паліцыі Анджэй Фіёлек. Асобу загінулага пацвердзіў другі мігрант, з якім патанулы спрабаваў пераправіцца праз раку. Паводле інфармацыі паліцыі, двое сірыйцаў спрабавалі пераправіцца праз Буг, аднак ніводны з іх не ўмеў плаваць.

Канчатковай мэтай мігрантаў з'яўляецца не Польшча і не Літва. Такім меркаваннем у эфіры «Альфа Радыё» падзяліўся палітолаг Аляксандр Шпакоўскі, каменціруючы заяву прафсаюза паліцэйскіх Германіі адносна неабходнасці ўвядзення часовага кантролю на граніцы паміж ФРГ і Польшчай у сувязі з павелічэннем колькасці бежанцаў. «Вядома, іх марай з'яўляецца Германія, а далей Францыя, дзе, у прынцыпе, выкарыстоўваючы калізіі мясцовага заканадаўства, можна даволі нядрэнна ўладкавацца, калі параўноўваць з тымі ўмовамі, якія былі ў гэтых людзей на радзіме», — звярнуў увагу эксперт. Па яго словах, у большасці выпадкаў мігранты, якія затрымліваюць нямецкія праваахоўныя органы, — языды з Сінджара. «Гэта рэгіён Сірыі, які быў практычна знішчаны баевікамі групоўкі «Ісламская дзяржава» і дзе мужчын забівалі, а жанчын прадавалі ў рабства, падвяргалі сексуальнай эксплуатацыі. Кошт у Сірыі і Лівіі за аднаго язіда пачынаўся ад $200. Гэта значыць, за $200 можна было набыць чалавека для розных патрэб. Зразумела, што гэтыя людзі будуць бегчы, прадаючы ўсё магчымае, — сказаў Аляксандр Шпакоўскі. — Яны здаюцца на тэрыторыі Германіі, спадзеючыся на абарону. У іх ёсць усе падставы атрымаць статус бежанца згодна з нормамі міжнароднага права, таму што ў рэгіёнах пастаяннага пражывання ім пагражае смерць. Гэта аб'ектыўна, таму што там утаймавалі частковa «Ісламскую дзяржаву», існуе шэраг іншых ісламісцкіх груповак. Язідаў з-за асаблівасцяў іх веравызнання там за людзей не лічаць. Гэта фактычна паўтарэнне нацысцкай ідэалогіі, толькі ў ролі ахвяр не цыганы і яўрэі, а язіды».

Паводле даных палітолага, да 80 працэнтаў асоб, якія накіроўваюцца праз Беларусь у Еўрапейскі саюз, у выніку дасягаюць сваёй мэты, абыходзячы пасты пагранічнай аховы Польшчы, Літвы і Латвіі. «Таму прафсаюз нямецкіх паліцэйскіх спрабуе прыкрыць граніцу, паколькі разумее, што граніца Еўрасаюза на польскім і літоўскім напрамках зусім не на замку», — рэзюмаваў аналітык.

Пры гэтым авіякампанія «Белавія» ніколі не ўдзельнічала ў арганізацыі перавозак нелегальных мігрантаў. Аб гэтым БелТА заявілі ў Дэпартаменце па авіяцыі ў сувязі з падрыхтоўкай Еўрасаюзам пятага пакета санкцый супраць Беларусі, а таксама заявай вярхоўнага прадстаўніка ЕС па замежных справах і палітыцы бяспекі Жазэпа Барэля аб дачыненні беларускага нацыянальнага авіяперавозчыка да арганізацыі нелегальнай перапраўкі мігрантаў у краіны ЕС. «Я прапанаваў бы Барэлю, можа быць, увесці санкцыі супраць Міжземнага мора. Бо тысячы і тысячы мігрантаў прыбываюць у Еўропу праз Міжземнае мора», — заўважыў у эфіры тэлеканала АНТ дырэктар Дэпартамента па авіяцыі Міністэрства транспарту і камунікацый Арцём Сікорскі. Ён звярнуў увагу, што «Белавія» сапраўды гэтак жа стала «пляцоўкай», праз якую гэтыя людзі бягуць за лепшым жыццём». «Яны не да нас прыйшлі, і нават не ў Літву, і не ў Польшчу», — заўважыў дырэктар Дэпартамента па авіяцыі.

Ён заўважыў, што звярнуліся да прэзідэнта Савета ICAO з прапановай: «Дайце нам пералік нацыянальнасцяў, краін — скажыце, хто не мае права карыстацца палётамі авіякампаніі «Белавія», каб прыбыць у Нацыянальны аэрапорт «Мінск», альбо іншымі авіякампаніямі, якія прыбываюць у аэрапорты краіны. І мы гэта апублікуем: «прабачце, гэтыя людзі карыстацца грамадзянскай авіяцыяй не могуць, — акрэсліў сітуацыю Арцём Сікорскі. — І ўсё».

На Беларусь і іншыя дзяржавы Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы ідзе гібрыдны наступ. Пра гэта БелТА заявіў старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей Рачкоў. «Гэта ціск не толькі эканамічны, але і палітычны, дыпламатычны. Таму мы павінны актыўна працаваць у міжнародных арганізацыях, паслядоўна даводзіць сваю пазіцыю на ўсіх пляцоўках», — падкрэсліў сенатар.

**Пётр ДУНЬКО.**

Блізкая ўлада

## Як заўжды — на сувязі

**Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай вертыкаллю працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.**

Тэлефонныя лініі ў суботу, 23 кастрычніка, з 9.00 да 12.00, правядуць:

• намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Генадзь Іосіфавіч БАРЫСЮК. Тэл. 8 016 221 31 21;

• старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір Уладзіміравіч ЦЯРЭНЦЬЕЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;

• намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Андрэй Анатольевіч БАРАНОЎСКІ. Тэл. 8 023 233 12 37;

• першы намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Юрый Мікалаевіч ВАЛЯВАТЫ. Тэл. 8 015 273 56 44;

• першы намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Анатоль Васільевіч УЛАСЕВІЧ. Тэл. 8 022 250 18 69;

• старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Наталля Віктараўна ЯКУБІЦКАЯ. Тэл. 8 017 500 41 60;

• намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Аляксандр Вікенцьевіч ДАРАХОВІЧ. Тэл. 8 017 222 44 44

Падзея

## «ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЯ ЎЛАСНАСЦЬ У СУЧАСНЫМ СВЕЦЕ:

### выклікі часу і перспектывы развіцця»

**Пад такой назвай Нацыянальны цэнтр інтэлектуальнай уласнасці сумесна з Дзяржаўным камітэтам па навуцы і тэхналогіях упершыню ў краіне правялі міжнародную навукова-практычную канферэнцыю.**

Да ўдзелу былі запрошаны вучоныя, прадстаўнікі беларускіх і замежных універсітэтаў, супрацоўнікі навуковых арганізацый, работнікі дзяржаўных органаў, якія практыкуюць спецыялістаў у сферы інтэлектуальнай уласнасці, магістранты, аспірантаў, ацэншчыкі аб'ектаў інтэлектуальнай уласнасці — усе, хто цікавіцца праблемамі аховы і абароны правоў на аб'екты інтэлектуальнай уласнасці, а таксама стварае і выкарыстоўвае вынікі інтэлектуальнай дзейнасці.

Як адзначыў **намеснік прэм'ер-міністра Аляксандр СУБОЦІН**, у краіне ў найбліжэйшы час плануецца зацвердзіць Стратэгію Беларусі ў сферы інтэлектуальнай уласнасці да 2030 года.

Паводле яго слоў, ключавымі задачамі тут з'яўляюцца развіццё рэгіянальнага і міжнароднага супрацоўніцтва, лічбавізацыі адміністрацыйных працэсаў, трансфер тэхналогій і камерцыялізацыя інавацый, падрыхтоўка кадраў, развіццё творчага і вынаходніцкага патэнцыялу моладзі. У найбліжэйшы час, сказаў Аляксандр Субоцін, плануецца зацвердзіць гэты дакумент на ўзроўні ўрада.

Паводле слоў **старшыні Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Уладзіміра ГУСАКОВА**, усё, што робіць сённяшнія вучоныя, — гэта і ёсць база інтэлектуальнай уласнасці ва ўсіх галінах: космас, электратранспарт, біятэхналогіі, сельская гаспадарка і іншыя. «У цэлым беларускае заканадаўства ў гэтай галіне дастаткова развітое, правы распрацоўшчыкаў абаронены. Павінна быць прамая сувязь вынікаў вучоных і мер матэрыяльнага стымулявання», — падкрэсліў ён.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**

Надвор'е

## ТЭМПЕРАТУРНЫЯ АРЭЛІ КАСТРЫЧНІКА

### У нядзелю нас ладна падмарозіць, а потым зноў цёпла

**Да канца тыдня ладна пахаладае, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**



Заўтра наша краіна будзе знаходзіцца пад уплывам атмасферных франтоў і прахалодных паветраных мас, якія ссоўваюцца з Балтыкі. Чакаецца воблачна з праясненнямі. На большай частцы нашай тэрыторыі пройдуць кароткачасовыя дажджы. Вецер парывісты, месцамі па паўднёвым захадзе моцны парывісты. Уначы — ад плюс 3 да 8 градусаў цяпла. Удзень — да 6—12 градусаў са знакам плюс.

Значна панізіцца тэмпературны рэжым у нядзелю. Ужо з раніцы стане халадней. Ападкі ў многіх рэгіёнах спыняцца, толькі ўначы па паўночным усходзе краіны пройдуць невялікія кароткачасовыя дажджы. Менавіта ў нядзелю сіноптыкі дзе-нідзе месцамі прагназуюць першы ў гэтым сезоне невялікі снег. Вецер паўночна-заходні ўмераны, уначы парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 3 градусаў да плюс 3 градусаў. Удзень будзе 4—10 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, у панядзелак і аўторак надвор'ем будзе кіраваць вобласць павышанага атмасфернага ціску і халодная паветраная маса. У гэтыя два дні чакаецца пераменная воблачнасць і без ападкаў. Уначы і раніцай месцамі прагназуецца туман. Вецер паўночны з пераходам на паўднёвы ўмераны. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 5 градусаў да 3 градусаў са знакам плюс. Удзень тэмпература будзе знаходзіцца ў межах ад плюс 5—7 градусаў да 10—12 цяпла.

На гэтым халодная порцыя для канца кастрычніка скончыцца. Ужо з сярэдзіны наступнага тыдня халоднае паветра пакіне нашу краіну і ўсталюецца ўмерана-цёплае надвор'е. Гэта будзе не зусім бабіна лета, але ўсё ж сонечнае надвор'е.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ШТО З ДАРОГАЙ ДА ВЫСТАЎКІ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Па дапамогу ў карпункт звярнуўся жыхар вёскі. Пенсіянеру Валерыю Мікалаевічу Спаткаю, які там жыве на вуліцы Сонечная, за семдзесят. Працаваў калісьці апаратарам на студыі тэлебачання, на будоўлях, у тым ліку і ў Маскве. Рукі залатыя — кажуць пра такіх мужчын.

Вяскоўцам ён стаў пасля таго, як прадаў пару гадоў таму ў цэнтры Віцебска двухпакаёвую кватэру і перабраўся ў Выстаўку. Спадабалася, што недалёка: усяго кіламетраў пятнаццаць ад абласнога цэнтра, да таго ж тут нешматлюдна. Пажадаў чалавек жыць бліжэй да прыроды, вырошчваць агародніну і садавіну, трымаць курэй.

Некалькі месяцаў таму, падчас прамой тэлефоннай лініі з памочнікам Прэзідэнта — інспектарам па Віцебскай вобласці Анатолем Лінeвічам, ён распавёў аб праблеме, якая паўстала на новым месцы жыхарства. Спадзяваўся, што пасля таго, як сутыкнуўся з бяссіллем прадстаўнікоў мясцовай улады, знойдзе дапамогу на ўзроўні больш высокім.

## «Праехалі міма»...

Валерый Спаткай вельмі эмацыянальна расказваў пра тое, як даручэнне Анатоля Лінeвіча адказныя за вырашэнне праблемы выканаць не маглі, бо... спачатку праехалі міма праблемнага ўчастка, хоць пенсіянер абазначыў яго палкамі.

— Я ж усё растлумачыў. Нумар майго тэлефона запісалі, дык патэлефанавалі б, я паказаў бы асабіста! — гаруе пенсіянер.

Ён зноў тэлефанаваў у райвыканкам. Спрабаваў яшчэ раз дазваніцца Лінeвічу...

Нарэшце, у канцы чэрвеня новы жыхар Выстаўкі патэлефанаваў на «прамую лінію» старшыні Віцебскага аблвыканкама Мікалаю Шарснёву.

Журналісты тады таксама зафіксавалі вусны зварот Валерыя Спаткая. Сама назва вёскі — Выстаўка — чапляе. Заяўнік распавёў гісторыю сваіх папярэдніх зваротаў да прадстаўнікоў улады. Ён абраў тон спакойнай канстатацыі сутнасці справы. Пенсіянер разумее, што асфальт — рэч дарагая, што на шлях да вёскі, дзе ў асноўным валодаюць дамамі дачнікі, немэтазгодна выдаткоўваць столькі сродкаў.

Кіраўнік абласной вертыкалі ўлады даў даручэнне кіраўніку КУП «Віцебскаблдарбуд» Уладзіміру Мацвееву разабрацца.

## У спраўным стане?

Аднак да першай паловы кастрычніка так нічога зроблена і не было. Валерый Спаткай прынцыпова чакаў гэтага тэрміну, бо паверыў у абяцанні адказных асоб.

У лісце ад 9 ліпеня за подпісам старшыні камітэта па архітэктуры і будаўніцтве Аляксандра Шыдлоўскага паведамляецца, што начальнік філіяла «Віцебскае ДРБУ № 144» і старшы майстар 7 чэрвеня высветлілі на месцы, што ўчастак дарогі працягласцю 200 метраў, па якім вясной і восенню падчас бездаражжы праезд можа быць абцяжараны, на сёння ў добрым стане... «Праезд транспартных сродкаў забяспечаны», — цытата. Можа, мелася на ўвазе, што, калі пойдуць восеньскія дажджы, тады дарожнікі зноў прыедуць паглядзець?

Вельмі папулярны ў савецкі час кіначасопіс «Фитиль», безумоўна, зацікавіўся б гэтай гісторыяй.

У лісце ад 12 ліпеня той самы генеральны дырэктар КУП «Віцебскаблдарбуд», які публічна атрымаў даручэнне губернатара, напісаў пенсіянеру, што з пачатку сезона (вясной) выкананы работы па прафіляванні друзавага ўчастка дарогі Бялынавічы — Войтава праз Выстаўку працягласцю 9,5 кіламетра, «з даданнем новага матэрыялу па асфальтабетонным участку выкананы ямачны рамонт пакрыцця», і што дарога ў цэлым у добрым стане. «Пры выяўленні дэфектаў ліквідацыя будзе праведзена работамі па ўтрыманні», — цытата. На мой погляд, напісана незразумела, але, напэўна, дарожнікі ведаюць «сакральны сэнс» сваіх фармулёвак.



## А сабачку было б шкада...

Калі пенсіянер на старой іншамарцы вёз мяне ў вёску спачатку па трасе, якая вядзе ў бок прыгранічча з Расіяй, надвор'е было ідэальным для восені. Сонейка не толькі свяціла, але і добра прыгравала. Вядома, пры такіх умовах дарога больш-менш у нармальным стане.

Але праз некалькі хвілін, як звярнулі з трасы, як кажуць, пятай кропкай адчуў, што вельмі і вельмі, мякка кажучы, нязручна ехаць па тых самых двухстах праблемных метрах дарогі.

Вадзіцель распавёў, што з-за гэтага прыходзіцца раскашэльвацца на тое, каб рамантаваць аўтамабіль і купляць запасныя часткі.

— У мяне вельмі маленькая пенсія. На аўто ўсё ж зручней, чым на аўтобусе, прывезці нешта ў вёску, унукам у горад адвезці бульбу і іншае. Некалькі падшыпнікаў памяняў пазаўчора, заплаціў за кожны ад 25 да 40 рублёў, — скардзіцца суразмоўца.

А што думаюць аднавяскоўцы?

Пагутарыў я з мужам і жонкай, якія ў цёплы сезон жывуць у Выстаўцы. Вячаслаў Віктаравіч узначальвае філіял фірмы. Пагадзіўся, што дарога нязручная.

— Але ж гэта яшчэ не бяда — па ёй небяспечна ехаць! — дадаў.

Разам з Валерыем Спаткаем яны сталі паказваць праблемныя метры. Некаторыя — больш за дваццаць сантыметраў глыбінёй. Незразумела мужчынам, чаму замест друзу для падсыпкі выкарыстоўваюць пясок і гліну.

Жонка Вячаслава Віктаравіча не ўтойвала крыўды на чыноўнікаў. Успомніла, як выгульвала сабаку, а на паваротцы з кузава трактара вываліўся цюк саломы. А калі б нехта пацярпеў? Жанчына кажа, што кожны вялікі дожджператварае дарогу ў пагрозу для тых, хто ёй карыстаецца.

Незадаволены станам дарогі і малады мужчына Яўген. Жыве ён у Віцебску і тут — у дзедавай хаце. Ды і брат «амаль што вясковец». Сказаў, што апошні раз увесну бачыў тут грэйдар. Каб насамрэч палепшыць стан пакрыцця, рэальна не было нічога зроблена. Дарогу размывае, сказаў, у сельсавет і ён тэлефанаваў, ды яны ж не адказваюць за рамонт дарог — толькі могуць перадаць сігнал. Вельмі незадаволены дарожнай праблемай і пенсіянер Міхаіл Чугуноў.

## Скаргаў усё больш

Да кіраўніцтва мясцовай улады Віцебскага раёна штогод усё больш «дарожных заяў».

У 2019-м — 28 абгрунтаваных зваротаў грамадзян, у 2020 — 27, сёлета — 49... З мінулага года застаюцца нявырашанымі 13 зваротаў. Ад кольшкасці ўсіх зваротаў гэта складае, адпаведна, каля 20 працэнтаў.

Што да працягласці мясцовых дарог, то лічба ўражвае: каля 934 кіламетраў. Для параўнання: ад Віцебска да Мінска — прыкладна 290 кіламетраў, да Брэста — 627, да Гомеля — 330.

Дарэчы, пра дарожныя праблемы нядаўна казаў на сесіі Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў і старшыня Віцебскага раённага Савета дэпутатаў Віктар Дарожкін. З трох аўтагрэйдараў у арганізацыі, якая адказвае за мясцовыя дарогі, фактычна працуе адзін, астатнія ў рамонце. На бягучы рамонт сёлета вылучылі 374 тысячы рублёў, на ўтрыманне — больш за мільён. Фінансаванне змяншаецца. На працягу трох гадоў (2019—2021) прадпрыемству не вылучаліся сродкі на капітальны рамонт.

Такім чынам, і без пад'езду да Выстаўкі хапае галаўнога болю. Становіцца зразумелай бездапаможнасць дарожнікаў і прадстаўнікоў мясцовай улады.

Тым не менш бяспека на дарогах — гэта жыцці людзей. Ды і давер да ўлады трымаецца на тым, наколькі адказна выконваюцца абяцанні яе прадстаўнікоў.

Пра гэта ўвесь час кажуць кіраўнікі абласной вертыкалі, верхняй і ніжняй палат парламента, дзяржкантролю і іншых органаў улады. Даў слова — зрабі, ды так, каб людзі былі задаволеныя. Не можаш — не абяцай, не называй канкрэтны тэрмін выканання.

**Старшыня Віцебскага Савета дэпутатаў Уладзімір ЦЯРЭНЦЬЕЎ** даручыў тым кіраўнікам раённых Саветаў, якія гадамі скардзяцца на дарожныя праблемы, прыдумваць, як іх вырашаць, дзе шукаць дадатковае фінансаванне. Прывёў прыклады таго, як гэта можна зрабіць. Прапанаваў эканоміць на аптымізацыі кіраўнікоў дарожных арганізацый, рацыянальна выкарыстоўваць будаўнічыя матэрыялы, зарабіць грошы на суботніку.

## Цуд не адбыўся

А што на сёння ў Выстаўцы? Карэспандэнт «Звязды» патэлефанаваў памочніку старшыні Віцебскага аблвыканкама, у аддзел па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб гэтага ж органа ўлады. Высветлілася, што пытанне на кантролі.

Валерый Спаткай паведаміў, што праз некалькі дзён пасля таго, як карэспандэнт прыехаў у Выстаўку, тут з'явіліся дарожнікі. Пазней на дарогу высыпалі тры грузавікі пяску.

— Маўляў, з адной чацвёртай друзу ад аб'ёму, так мне сказаў адзін з дарожнікаў, — удакладніў пенсіянер.

Змагар за якасць дарогі і яго аднадумцы лічаць, што гэтае пакрыццё не тое, якое зробіць праезд бяспечным пры дрэнным надвор'і. Неабходна больш друзу, бо пясок хутка стане кашай і нельга будзе нармальна праехаць.

Ды і чаму грэйдар выраўняў толькі палову праблемнага ўчастка дарогі — бліжэй да трасы, а ў бок вёскі — не? — здзіўляюцца яны.

Жыхар Выстаўкі непакоіцца, што ў выніку дарожнікам прыйдзецца ўсё перарабляць, адпаведна, будуць зноў патрачаны грошы, час і нервы...

Чым скончыцца гэта гісторыя, паведамім.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ,**
**фота аўтара.**


## «Дзень адчыненых дзвярэй» у беларускіх сядзібах!



**Які адпачынак самы актуальны ў любую пару года? Вядома ж, адпачынак у сядзібах!**

У вас ёсць выдатная магчымасць пазнаёміцца з цікавымі сядзібамі ў розных кутках нашай краіны на традыцыйным мерапрыемстве **«Дзень адчыненых дзвярэй»** у беларускіх сядзібах.

Вас чакае:
- знаёмства з гаспадарамі сядзіб;
- магчымасць спланаваць свой будучы адпачынак;
- экскурсіі па сядзібах, пачастункі, майстар-класы, невялікія канцэрты.

Адпачынак у беларускай вёсцы заўсёды прыцягвае ўвагу сваім каларытам, а цёплы прыём гаспадароў падорыць яшчэ больш добрых уражанняў, якія вы павезяце з сабой!

**Дата правядзення: 23 кастрычніка 2021 г.**

Да ўсіх, хто вырашыць паехаць у сядзібу, пераканаўчая просьба — АБАВЯЗКОВА патэлефанаваць гаспадарам сядзіб і ўзгадніць час свайго візіту. Спіс сядзіб даступны па спасылцы https://www.belarustourism.by/bitrix/templates/.default/components/bitrix/news.list/main-inklyuzivnyy-turizm.

УНП190276566



## ДОПОЛНЕНИЯ К ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ ООО «НикаПроект», опубликованной в газете «Звязда» 26.02.2021 г.

по объекту «Многоквартирный жилой дом со встроенными помещениями на пересечении ул. Прилукской–ул. Глаголева–пр-т Жукова в г. Минске 3-я очередь строительства 3–7-я секции».

**Характеристика объекта строительства:** Проектной документацией предусматривается строительство встроенного нежилого помещения общей площадью 162,70 кв. м, расположенного в 3-й секции на 1-м нежилом этаже с обособленным входом непосредственно с улицы с уровня земли.

Высота помещения составляет 3,55 метра. Встроенное помещение изолировано от жилой части дома глухими стенами и перегородками. Окна и входные двери – витражные из алюминиевых профилей с заполнением стеклопакетами. В качестве наружной отделки стен применяются навесной «вентилируемый фасад» с применением керамогранитных плит. Проектом предусмотрено создание безбарьерной среды, а также благоустройство территории в границах работ 3-й очереди.

Встроенное помещение передается с черновой внутренней отделкой: штукатурка стен, стяжка пола. Система отопления встроенного помещения выполняется отдельно от системы отопления жилого дома, с установкой индивидуального прибора учета тепла. Отопление водяное, предусмотрена вертикальная и горизонтальная (в конструкции стяжки пола) разводка, отопительные приборы. Система вентиляции встроенного помещения – приточно-вытяжная механическая и частичная естественная вентиляция (приток) с механической вытяжкой. Водоснабжение встроенного помещения – от отдельной системы водопровода низкого давления с установкой индивидуальных приборов учета потребляемой воды, предусмотрена установка и подключение унитаза. Электроснабжение встроенного помещения – разводка до вводного устройства с установкой вводного устройства и счетчика. Запроектировано строительство пассивной оптической сети, предусматривающей телефонизацию и телефикацию по протоколу IP и подключение к Интернету по технологии xPON – ввод сетевого кабеля в помещение, оптическая розетка. Встроенное помещение оборудуется автономной неадресной системой пожарной сигнализации и системой оповещения – типа «СО-2». По соглашению сторон отдельные виды работ могут не выполняться.

**Гражданам, не состоящим на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, индивидуальным предпринимателям и юридическим лицам для заключения договоров создания объектов долевого строительства предлагаются офисные помещения по цене за 1 кв. м, эквивалентной 1 500,00 долларам США.**

**Условия оплаты:** оплата 100 % стоимости объекта долевого строительства в течение 5 (пяти) рабочих дней с момента регистрации договора создания объекта долевого строительства в местном исполнительном и распорядительном органе. Подлежащая оплате сумма определяется по официальному курсу белорусского рубля к доллару США, установленному Национальным банком Республики Беларусь на день платежа. По соглашению сторон дольщику могут быть предоставлены скидки от общей стоимости объекта либо иные условия его оплаты.

УНП 191581623



## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении повторного аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона), по поручению ОАО «Минский мясокомбинат» (продавец), проводит повторный открытый аукцион по продаже изолированного помещения, наименование – магазин с инв. № 500/D-1003744 общей площадью – 543,7 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 500000000003001058 площадью 0,3585 га (право постоянного пользования, доля в праве 7/100) по адресу: г. Минск, тракт Игуменский, 47-2н.

Объект обременен договором аренды по 31.07.2025.

Начальная цена с НДС (20 %) – 1 256 850,00 бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – 125 685,00 бел. руб.). (Начальная цена снижена на 14,5 %).

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации». Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней после дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 2 (двух) процентов. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущие извещения были опубликованы в газете «Звезда» от 27.07.2021, 28.09.2021. Аукцион состоится 05.11.2021 в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 04.11.2021 до 16.00 по указанному адресу в каб. 320. Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, (8029) 136-31-11.

УНП 100003394


Утерянный договор страхования форма ЗК серия BY07 № 20813587, страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест» считать недействительным.

# ФІШЫНГ, ВІШЫНГ — ДВА КІТЫ КІБЕРЗЛАЧЫННАСЦІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Даверыўшыся саліднаму суразмоўцу, жанчына ўстанавіла на смартфон дадатак аддаленага доступу. Падчас далейшых размоў мінчанку пераканалі: што яна павінна аформіць на сваё імя крэдыт на суму дзве тысячы беларускіх рублёў, што яна і зрабіла. Калі ёй на рахунак паступілі сродкі, жанчына засумнявалася, што той, хто тэлефанаваў, сапраўды з'яўляецца работнікам асацыяцыі банкаў, і паведаміла яму пра гэта. Каб развеяць сумненні, ілжэбанкір даслаў пацярпелай у месенджар Viber фатаграфію пасведчання супрацоўніка органаў унутраных спраў.

Мінчанка паверыла інфармацыі і аформіла яшчэ два крэдыты. Пасля таго, як жанчына, прытрымліваючыся інструкцыі зламыснікаў, дазволіла ім падключэнне да свайго мабільнага тэлефона, тыя змаглі даведацца рэквізіты яе банкаўскіх плацежных картак, аўтарызавацца ад яе імя ў асабістым кабінеце інтэрнэт-банкінгу і дыстанцыйна распараджацца грашовымі сродкамі.

Па дадзеным факце ўзбуджаная крымінальная справа па ч. 3 арт. 212 (крадзеж маёмасці шляхам мадыфікацыі камп'ютарнай інфармацыі, здзейснены ў буйным памеры) КК. Праводзяцца следчыя дзеянні і аператыўна-вышуковыя мерапрыемствы па ўстанаўленні асоб, якія ўчынілі злачынствы, рыхтуюцца даручэнні аб аказанні міжнароднай прававой дапамогі.

Чарговы раз следчыя просяць грамадзян быць пільнымі: пры выкарыстанні гандлёвых пляцовак здзяйсняйце ўсе дзеянні выключна на самой платформе аб'яў. Не пераходзіце па спасылках, якія высылаюць невядомыя суразмоўцы. Не давайце трэцім асобам звесткі аб уліковым запісе ў інтэрнэт-банкінгу і мабільным банкінгу. Нікому ні пад якой падставай не перадавайце рэквізіты сваіх банкаўскіх картак, у тым ліку CVV-код. Калі вам тэлефануюць з падобнымі просьбамі, прадстаўляючыся супрацоўнікамі банка, спыніце размову і пры неабходнасціператэлефануеце ў кліенцкую службу вашага банка (нумар паказаны на банкаўскай картцы) для ўдакладнення ўсіх пытанняў. Памятайце, што супрацоўнік банка ніколі не будзе атрымліваць інфармацыю ў кліента аб поўных рэквізітах, тым больш з дапамогай тэлефоннага званка. У выпадку страты банкаўскай аплатнай карткі звярніцеся ў банк для яе блакіравання.

## Не толькі ў Мінску...

Жыхар Барысава ўстанавіў ашуканскую праграму на тэлефон і страціў амаль 18 тысяч беларускіх рублёў, паведаміла **афіцыйны прадстаўнік УСК па Мінскай вобласці Алена КРУПЕНІНА.**

«Жыхар Барысава, 50-гадовы кіроўца, пасля камандзіроўкі знаходзіўся дома, калі ў Viber патэлефанаваў невядомы, прадставіўся супрацоўнікам банка і паведаміў, што ад яго імя пададзена некалькі заявак на афармленне крэдытаў. Зламыснік парэкамендаваў усталяваць «праграму дапамогі» на мабільны тэлефон, каб гэта праверыць, пасля чаго запусціць дадатак банка, у якім абслугоўваўся кіроўца. Той паверыў незнаёмаму і ўстанавіў праграму. На самай жа справе гэта быў дадатак аддаленага доступу, з дапамогай якога кіберзлачынцы могуць падлучацца да тэлефона і назіраць усё, што адбываецца на экране. Неўзабаве на смартфон прыйшлі паведамленні аб змене імя карыстальніка і пароля ад паслугі «інтэрнэт-банкінг», — распавялі ва УСК.

Пасля гэтага зламыснік паведаміў мужчыне, што неабходна асабіста з'явіцца ў некалькі банкаў, каб у далейшым з іх боку не было прэтэнзій, падаць заяўкі на крэдыты і пералічыць грашовыя сродкі на сваю банкаўскую аплатную картку. Барысаўчанін наведаў аддзяленні трох банкаў, дзе ўзяў крэдыты на агульную суму каля 18 тысяч рублёў, і па ўказанні невядомага пералічваў грашовыя сродкі на свой карт-рахунак, пасля чаго запускаў праграму аддаленага доступу.




«Супрацоўнік» банка ўвесь час быў на сувязі, цікавіўся ходам разгляду заявак, па тэлефоне даваў указанні, як дзейнічаць. Пасля паведаміў, што з ім звяжацца следчы, які з дапамогай супрацоўнікаў міліцыі і канфіскацыі запісаў камер відэаназірання паспрабуе выявіць зламысніка. Праз некаторы час пацярпеламу са схаванага нумара патэлефанаваў мужчына, які прадставіўся следчым і расказаў аб дзеяннях, якія ён плануе правесці.

Адразу ж пайшлі СМС-паведамленні аб залічэнні і спісанні грашовых сродкаў, а затым, праз месяц, — і паведамленні з банкаўскіх устаноў аб неабходнасці аплаты крэдытаў. Толькі тады барысавец зразумеў, што трапіўся на удачку зламыснікаў, і звярнуўся ў праваахоўныя органы.

Аб апошніх тэндэнцыях у злачынствах з выкарыстаннем высокіх тэхналогій расказаў **начальнік аддзела па расследаванні злачынстваў супраць інфармацыйнай бяспекі і незаконнага абароту наркотыкаў Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь па Мінскай вобласці падпалкоўнік юстыцыі Артур ВОЛЬСКІ.**

***— Артур Станіслававіч, давайце пачнём з таго, што нагадаем нашым чытачам: што ўяўляюць сабой злачынствы з прымяненнем інфармацыйных тэхналогій?***

— Я хацеў бы адзначыць, што мы, прааналізаваўшы статыстыку, прыйшлі да таго, што з 2019 года ў краіне фіксуецца значны рост так званых кіберзлачынстваў або злачынстваў, звязаных з сеткай Інтэрнэт як спосабам учынення злачынстваў. Толькі за 8 месяцаў 2021 года ўпраўленнем Следчага камітэта па Мінскай вобласці распачата 1472 крымінальныя справы гэтай катэгорыі. У той час як за 8 месяцаў 2020 года іх было 1209. У параўнанні з 2020 рост неістотны, але да 2019 года іх было значна менш.

***— Якім жа чынам ажыццяўляюцца крадзяжы?***

— Часцей за ўсё гэтыя крадзяжы адбываюцца шляхам фішынгу і вішынгу. Вішынг — спосаб вербальнага пераканання чалавека перадаць тую ці іншую інфармацыю. Часта пацярпелыя атрымліваюць тэлефонныя званкі ў Viber або ў WhatsApp. Злачынцы пад выглядам работнікаў банка ці праваахоўных органаў у ходзе размовы выманьваюць канфідэнцыяльную інфармацыю аб банкаўскіх плацежных картках. Гэта асноўны, самы вялікі масіў зладзействаў, якія актыўна доўжацца з 2019 года.

Часта сустракаецца, калі зламыснікі ў ходзе зносін пад рознымі падставамі просяць устанавіць рознае праграмнае забеспячэнне, якое дазваляе ажыццяўляць аддалены доступ да іх мабільных прылад. Асабліва часта ахвярамі зладзеяў становяцца жанчыны сярэдняга ўзросту і пенсіянеры. Пацярпелыя ўстанаўліваюць пэўную праграму, часцей AnyDesk, і тады зладзеі падключаюцца да іх прылад, просяць выдаліць дадатак М-банкінг. Чалавек выдаляе, потым яго зноў устанаўлівае і такім чынам трапляе ў «люстэрка», дзе зламыснік бачыць усе аўтэнтыфікацыйныя даныя: як пацярпелы ўводзіць логін, пароль. Атрымліваецца поўны доступ, і тады ўсё, што заўгодна, можа рабіць з яго грашыма.

Як правіла, грашовыя сродкі пераводзяць на розныя электронныя грошы, на іншыя банкаўскія карткі, ажыццяўляюцца розныя аплаты. Яны выводзяцца з дапамогай так званых дропаў.

**Асабліва часта ахвярамі зладзеяў становяцца жанчыны сярэдняга ўзросту і пенсіянеры.**

Ёсць выпадкі, калі людзі за ўзнагароджанне просяць зарэгістраваць карты асацыяльных грамадзян, у якіх ёсць пашпарты. Напрыклад, 10 карт зарэгістраваў, 10 рублёў атрымаў, камусьці іх аддаў — і пачынаецца рух па рахунку пацярпелага. Вельмі шмат грашовых сродкаў сыходзяць на Qiwi-кашалькі і іншыя аплатныя сістэмы.

***— Якія выпадкі махлярства вам запомніліся найбольш?***

— Урэзалася ў памяць свежая справа, узбуджаная ў канцы верасня 2021 года па ч. 4 арт. 209 (махлярства). У гэтай сітуацыі жанчына ў сетцы «УКантакце» знаёміцца з мужчынам, які прадстаўляецца генералам арміі ЗША. «Генерал» тлумачыць, што праходзіць службу, напрыклад, у Іраку (тут могуць быць варыянты). Жанчына яму, канешне, вельмі спадабалася. Яны доўга перапісваюцца, пераходзяць потым з «УКантакце» на WhatsApp або Viber. Зламыснік уваходзіць у давер, прычым па перапісцы відаць, што ён карыстаецца звычайным Google-перакладчыкам. Ён тлумачыць, што дрэнна валодае рускай мовай.

Праз некаторы час ён кажа: я кахаю, жыць без цябе не магу, армія ЗША павінна пералічыць некалькі мільёнаў долараў за маю службу, хачу прыехаць да цябе ў Салігорск, але зараз мне трэба знайсці замену. А каб знайсці замену такому высакакласнаму спецыялісту, як я, трэба пералічыць грошы таму, хто пагадзіўся б падмяніць мяне. Жанчына на працягу двух месяцаў сем разоў пераводзіць грашовыя сродкі з дапамогай Western Union у Турцыю. Бярэ крэдыт у банку, потым некалькі разоў пераводзіць зберажэнні бацькоў, потым бярэ яшчэ адзін крэдыт у іншым банку, затым — яшчэ ў адным, да апошняга давяраючы зламысніку. І толькі ў адзін момант хтосьці з больш дасведчаных родных літаральна за руку вядзе яе ў міліцыю. Высветлілася: у агульнай суме пацярпелая пералічыла «генералу» каля 18 тысяч долараў.

**Супрацоўнік банка ніколі не будзе атрымліваць інфармацыю ў кліента аб поўных рэквізітах, тым больш з дапамогай тэлефоннага званка.**

Сёлета мы скончылі вялікую крымінальную справу, звязаную з крадзяжом на адной папулярнай гандлёвай пляцоўцы. Пацярпелыя, як правіла, размяшчаюць аб'явы аб продажы якіх-небудзь рэчаў. Зламыснікі, два родныя браты, ураджэнцы Крупскага раёна, знялі хостынг, арандавалі даменнае імя і стварылі так званую фішынгавую спасылку, якая называлася Куфар.СС. У тэлеграм-канале стварылі групу «Коцік Цім», куды прыцягвалі так званых воркераў — людзей, якія непасрэдна кантактавалі з пацярпелымі на сайце Куфар. Гэтыя воркеры пішуць любому чалавеку: напрыклад, мяне зацікавіла рэч, я хацеў бы яе набыць. Давайце працягнем зносіны ў Viber. Для адводу вачэй удакладняюць дэталі прадаванага тавару. Потым воркер піша, што хацеў бы набыць гэтую рэч, але знаходзіцца ў іншым горадзе і прапануе аформіць Куфар-дастаўку.

Воркер дасылае фішынгавую спасылку Куфар.СС і просіць запоўніць форму ў дастаўцы, а іншы потым націснуць на «атрымаць грашовыя сродкі». Пацярпелы націскае на спасылку, запаўняе форму, у якой пазначаны картка, CVC або CVV код, тэрмін дзеяння карткі. Пасля запаўнення пацярпелыя клікаюць на «атрымаць грашовыя сродкі» і аўтаматам трапляюць у бот, куды скідваюцца даныя банкаўскай карткі. Бот гэта ўсё генерыруе, і нашы два браты пераводзяць грашовыя сродкі праз біткоін-абменнік у тэлеграм-канале на біткоін-кашалёк. Цалкам выпадкова іх вылічылі. У іх былі канфіскаваны звесткі парадку 350 скампраметаваных картак. Зараз суд разглядае гэтую справу.

Таксама вельмі распаўсюджана махлярства з «крэдытамі». Тэлефануюць людзям, як правіла, сталага ўзросту, прадстаўляюцца супрацоўнікамі банка. Зламыснікі тлумачаць пацярпеламу, што па яго банкаўскай картцы адбываюцца падазроныя аперацыі альбо расказваюць, што акурат у гэты момант аплачваецца крэдыт. Зламыснік звязвае пацярпелага з «праваахоўнымі органамі», праводзіць аператыўную камбінацыю.

Усё гэта адбываецца ў Viber, нумары ўсе не беларускія. Пацярпеламуператэлефаноўваюць нібыта са «следчага камітэта» ці проста з «міліцыі» і прапануюць дапамагчы следству. Зламыснікі тлумачаць: для таго, каб банк не выдаў крэдыт, які нібыта цяпер хочуць узяць на ваша імя, вы павінны рэальна пайсці ў банк і ўзяць крэдыт пад кантролем праваахоўных органаў, перавесці грошы на банкаўскую карту, а потым яны гэты крэдыт пагасяць. Пацярпелы бярэ крэдыт, паведамляе ўсе рэквізіты. Зламыснікі ўвесь час на сувязі. Калі злучэнне па нейкіх прычынах перарываецца, яны адразуператэлефаноўваюць у Viber.

## Як іх выявіць

***— Ці атрымліваецца вылічыць інтэрнэт-махляроў?***

— Сам працэс раскрыцця абцяжараны тым, што грашовыя сродкі пераводзяцца не непасрэдна да злачынцаў, а праз розных пасрэднікаў. Плюс да ўсяго, нават атрымліваючы доступ да інтэрнэт-банкінгу, асабістага кабінета пацярпелых, зламыснікі выкарыстоўваюць сродкі ананімізацыі: VPN, TOR, шыфруюць свае IP-адрасы. Большасць спраў раскрываліся ад апошняга звяна, г. зн. ад таго, куды сышлі грашовыя сродкі. Толькі такім чынам мы можам раскрыць тую ці іншую махінацыю.

***— Як зразумець, што перад намі — махляр?***

— Зразумець можна толькі па тым, што ён патрабуе. Непадрыхтаванаму чалавеку сапраўды цяжка бывае адразу зразумець, бо зламыснікі валодаюць пэўнай лексікай банкаўскага супрацоўніка, выкарыстоўваюць спецыяльныя сродкі. Напрыклад: вам заразператэлефануюць, і ідзе фонавая музыка, як у банку, створаны шум, быццам бы актыўнай работы ў офісе. Антураж і аўра такія, што пачынаеш верыць. Але трэба мець на ўвазе: калі ў вас пачынаюць прасіць банкаўскія звесткі, якія служачыя фінансавай установы ніколі не будуць у вас прасіць па тэлефоне, тады і ўдаецца вызначыць махляра.

***— Што рабіць, калі ўсё ж стаў ахвярай інтэрнэт-махлярства?***

— У першую чаргу неабходна заблакіраваць картку, каб спыніць аперацыі. Потым ужо ісці ў праваахоўныя органы, у міліцыю або ў Следчы камітэт. Пастарайцеся таксама запатрабаваць у банка звесткі руху сваіх грашовых сродкаў, каб мы маглі аператыўна дзейнічаць. Калі людзі прыходзяць да нас, мы падрыхтоўваем адпаведныя запыты, адпраўляем у банкаўскія ўстановы, атрымліваем падрабязную выпіску аб транзакцыях. Калі гэта ажыццяўлялася праз інтэрнэт-банкінг, мы бачым адрасы, куды сышлі грашовыя сродкі, бачым дату і час змены логіна і пароля. На жаль, і тут ёсць складанасці, таму што і нам банкі часта адказваюць не адразу.

Расследаванне і блакіраванне картак, аператыўнае атрыманне звестак, узаемадзеянне з калегамі за мяжой — гэта ўсё цудоўна. Але вызначальнае — павышэнне ўзроўню ведаў нашых грамадзян.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**

На сваім месцы

# РУПЛІЎЦЫ ПАМЯЦІ

## Найстарэйшыя супрацоўнікі Белдзяржмузея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ў дзень яго 77-годдзя — пра любоў да справы, якой прысвяцілі большую частку свайго жыцця

**Беларусь першая ў свеце стварыла музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Экспазіцыю пачалі збіраць тады, калі краіна знаходзілася пад акупацыяй. Хто ў вайне будзе пераможцам, было невядома... У год 70-й гадавіны вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў музей набыў новы дом, які ўжо ахрысцілі храмам памяці. Дзякуючы вялікай працы і прафесіяналізму шырокага кола людзей была створана экспазіцыя, якая аб'ектыўна распавядае аб гераічных і трагічных падзеях у лёсе не толькі Беларусі, а і ўсяго свету.**

**Карэспандэнт «Звязды» сустрэлася з яго найстарэйшымі супрацоўнікамі. Ім пашчасціла працаваць побач са стваральнікамі ўстановы, збіраць калекцыі, якія дагэтуль з'яўляюцца візітоўкай музея. Менавіта гэтыя людзі клапаціліся, каб падчас пераезду ў новы будынак ні адзін экспанат не быў страчаны ці пашкоджаны, распрацоўвалі канцэпцыю экспазіцыі ў новых умовах, зрабілі ўсё дзеля таго, каб гісторыя даўно мінулай падзеі зацікавіла сучасніка, прымусіла задумацца, што вайна больш ніколі не павінна паўтарыцца.**




Найстарэйшая супрацоўніца музея амаль з паўвекавым стажам Наталля ФІЛІПОВІЧ удзельнічае і ў стварэнні часовых выставак, і экскурсію можа правесці.

**Уладзімір ВАРАПАЕЎ, дырэктар Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны:**

— Сёлета нашым калектывам шмат што зроблена, але наперадзе — новыя планы, праекты, дасягненні. Наш святы абавязак — перадаць памяць аб гэтай вайне нашчадкам, захаваць памяць аб героях Вялікай Айчыннай вайны, перасцерагчы будучыя пакаленні ад паўтору фатальных памылак мінулага, зберагчы мір на зямлі.

Хачу падзякаваць усім супрацоўнікам музея: тых, хто раней працаваў, а таксама тых, хто працягвае сваю справу ў гэтых сценах. Асаблівыя словы ўдзячнасці — нашым дарагім ветэранам музея за іх самаадданую працу. Для многіх ён стаў родным домам, для некаторых — адзіным працоўным месцам. Жадаю ўсім здароўя, шчасця і новых здзяйсненняў на карысць нашай краіны! Са святам!



Нягледзячы на пандэмію, у музеі па-ранейшаму шматлюдна.

### ЛЁС ПРАЗ СЯБЕ

Нягледзячы на свой паважны ўзрост, **вядучы навуковы супрацоўнік аддзела пісьмовых і выяўленчых крыніц Наталля ФІЛІПОВІЧ** па-ранейшаму ў страі — у пачатку 2022 года найстарэйшы супрацоўнік музея адзначыць 80-гадовы юбілей. Яна — дзіця вайны, нарадзілася ў акупаваным Мінску. На днях споўніцца 49 гадоў, як яна прыйшла працаваць у музей. Па тым часе Наталля Іосіфаўна з'явілася ўжо вопытным навуковым супрацоўнікам: за яе плячыма было дырэктарства ў адным з музеяў горада Варкута. Прапанова вярнуцца на Радзіму і прыступіць да работы ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны паступіла на навуковай канферэнцыі ў Ленінградзе ад Веры Раманоўскай, якая стаяла каля яго вытокаў. З таго часу Наталля Філіповіч месца работы больш ніколі не мяняла, пра што зусім не шкадуе.

— Музей — гэта ўсё маё жыццё: гэта мой дом, а калегі — мая сям'я, — прызнаецца яна. — Не кожная жанчына можа пахваліцца тым, што мае любімую работу. Задача музейнага супрацоўніка — не толькі збіраць экспанаты, захоўваць іх, а яшчэ і прапагандаваць памяць аб той жудаснай вайне, якая прайшла па нашай беларускай зямлі. Вывучаючы канкрэтны прадмет, апісваючы яго і ўносячы ў фонды, кожны лёс чалавека, каму ён належаў, мы прапускаем праз сябе. Па-іншаму проста немагчыма.

За сваю працяглую кар'еру Наталля Філіповіч сустракалася з вялікай колькасцю ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны. Яны прыходзілі ў музей, перадавалі на захоўванне асабістыя рэчы. Яе заўсёды ўражвала, што і франтавікі, і партызаны гаварылі аб тых агнявых гадах без смутку, нават з аптымізмам. Нягледзячы на тое, што навокал была смерць, шматлікія страты, нягоды, гэты страшны час яны згадвалі як найлепшы ў сваім жыцці — а ўсё таму, што тады яны былі маладыя.

### «ЗА КОЖНЫМ ЭКСПАНАТАМ — ЧАЛАВЕК»

**Галіна ПАЎЛОЎСКАЯ, загадчыца аддзела пісьмовых і выяўленчых крыніц**, прыйшла ва ўстанову 32 гады таму. Дзеля жадання працаваць у адным з вядучых музеяў краіны ёй нават давялося змяніць прафесію. Былы краўчыхай на вытворчасці, у вольны час рыхтавалася да сесій у БДУ, дзе завочна вучылася на гістарычным факультэце. Аднойчы яна даведалася, што ў ваенны музей патрабуецца спецыяліст, які добра валодае роднай мовай: беларускамоўных экскурсаводаў не хапала. Дырэктар Аляксандр Ульяновіч, які ў гады вайны дайшоў да Берліна і нават распісаўся на рэйхстагу, зладзіў для Галіны Уладзіміраўны экзамен, які тая паспяхова вытрымала.

— Тэма вайны была блізкая для майго пакалення: у адных ваявалі бацькі, у іншых — дзяды, — расказвае Галіна Паўлоўская. — Асабліва на слыху тыя падзеі былі ў сельскай мясцовасці. Мая вёска Вялікія Хальнявічы, што ў Крупскім раёне, знаходзілася пад акупацыяй, у мясцовых лясах з ворагам змагаліся партызаны. Усё сваё дзяцінства я чула аповеды пра вайну. Тады я нават яшчэ не здагадвалася, што ўсё гэта мне вельмі спатрэбіцца ў маёй працоўнай дзейнасці.

Загадчыца аддзела расказвае, што нават у цяперашні час у музей перадаецца шмат прадметаў, дакументаў, звязаных з гісторыяй вайны.

— Кожная рэч мае сваю энергетыку, яна прасякнутая мінулымі падзеямі, асобай чалавека, які ёю карыстаўся, — заўважае музейшчыца. — За кожным экспанатам — чалавек, яго гісторыя.

Нямала было і сустрэч, якія ўплывалі на свядомасць і пакідалі след у душы. Адну з іх Галіна Уладзіміраўна не можа забыць дагэтуль.

— У экспазіцыі захоўваецца няпоўны спіс ваеннапалонных, якія загінулі ў Шталагу-352 у Масюкоўшчыне: іх складалі ўрачы з ліку вязняў, — расказвае Галіна Паўлоўская. — У свой час супрацоўнікі музея распаўсюдзілі яго па ўсіх рэгіёнах Савецкага Саюза. Вельмі шмат было водгукаў. Людзі прыязджалі ў Масюкоўшчыну, каб убачыць месца, дзе загінулі іх родныя, і пакланіцца. Аднойчы ў наш музей завітала старэнькая бабуля з Ровенскай вобласці, якая з'явілася інвалідам дзяцінства. Яна была зусім кволая, нават размаўляла няшмат, таму тое, што жанчына даехала ў Мінск, было подзвігам: бабуля вельмі хацела наведаць месца, дзе спачывае яе родны брат (пра гэта даведалася менавіта з нашых спісаў). Мы суправадзілі яе ў Масюкоўшчыну. Бабуля прывезла сюды зямлю са сваёй радзімы, дзякавала, седзячы на камені каля брацкай магілы, брату, за якога шмат гадоў атрымлівала пенсію. На гэтым вялікім пахаванні яна чамусьці спынілася менавіта на адным канкрэтным месцы. Гэта сустрэча сястры з братам мяне ўразіла на ўсё жыццё...

### «МУЗЕЙ ДЛЯ НОВАГА ПАКАЛЕННЯ»

**Намеснік галоўнага захавальніка фондаў Галіна СКАРЫНКА** аддала музейнай справе, а таксама гісторыі вайны амаль паўстагоддзя (47 гадоў): працоўная кніжка не забіралася адсюль ні на адзін дзень! Музей без перабольшання стаў яе другім домам. Вельмі балюча Галіна Васілеўна ўспрыняла «змену жыхарства». Не магла стрымаць слёз, калі перадавала ў сучасны будынак апошні ордэн. Каб лягчэй прывыкнуць да новых умоў, падчас стварэння экспазіцыі шукала знаёмыя твары на фотаздымках, экспанаты, якія змяшчаліся яшчэ ў старым музеі.

— Настальгія мяне доўга не пакідала: перад вачыма стаялі цэлыя турыстычныя цягнікі з ветэранамі, якія прыязджалі да нас на экскурсіі з усяго Савецкага Саюза, — успамінае Галіна Скарынка. — Дагэтуль мурашкі па скуры, калі ўспамінаю ўдзельнікаў вайны, якія ішлі па залах, а на іх грудзях звінелі ўзнагароды. Яны маглі плакаць толькі ад таго, што знайшлі ў экспазіцыі назву свайго вайсковага злучэння. Сённяшніх жа наведвальнікаў, у асноўным моладзь, уражваюць поўнамаштабныя копіі франтавых самалётаў, сапраўдныя танкі, гарматы — безумоўна, гэта музей для новага пакалення. Усё мяняецца, і так павінна быць.

Галіна Скарынка расказвае, што ў савецкі час была вельмі дружная музейная супольнасць. Каб без чаргі трапіць на тую ці іншую выстаўку, па ўсім Савецкім Саюзе, дастаткова было паказаць працоўнае пасведчанне. Па яе словах, ранейшаму пакаленню было лягчэй працаваць у музеі: яшчэ ў дзяцінстве яны чыталі ваенную літаратуру, часта гутарылі з ветэранамі, жывыя былі бацькі, якія прайшлі вайну. Цяперашнім жа экскурсаводам, асабліва маладым, на яе думку, трэба старанна рыхтавацца да сустрэч з наведвальнікамі — у музей прыходзіць зацікаўлены, добра інфармаваны народ.

### РАСКАЗВАЦЬ ПРА ВАЙНУ — ЦЯЖКА

**Загадчыца аддзела гісторыі партызанскага руху Наталля ЯЦКЕВІЧ**, якая працуе ў музеі ўжо 43-і год, пра вайну таксама чула з першых вуснаў, прычым з самага дзяцінства — праз гэтае пекла прайшлі і маці, і бацька музейнай супрацоўніцы. Калі пачалася вайна, маці Наталлі Яцкевіч вучылася ў Бабруйскай школе медыцынскіх сясцёр. Сямнаццацігадовай дзяўчыне выдалі вінтоўку, шынель і адправілі на фронт. Удзельнічала ў першых абарончых баях, была моцна параненая: тое, што Наталля Анатолеўна і яе брат з'явіліся на свет, — вялікі цуд. Бацька сустрэў вайну першакурснікам чыгуначнага тэхнікума ў Томску. Яму таксама не было 18-і, але па ўласным жаданні пайшоў у ваенкамат. Пасля кароткай вучобы ў артылерыйскім вучылішчы яго накіравалі пад Харкаў, дзе ў той час была проста «мясарубка». Удзельнічаў у баях на Курскай дузе, там быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі. Дэмабілізаваўся толькі ў 1949 годзе.

Аднак былі ў сям'і і страты. Бабулю па матчынай лініі гітлераўцы забілі ў роднай вёсцы. Дзядзька, родны брат маці, загінуў пад Варонежам. Доўга не ведалі, як склаўся яго лёс. Брацкую магілу, дзе той спачывае, адшукалі не так даўно.

Наталля Яцкевіч доўгі час вадзіла экскурсіі па адным з найбольш эмацыянальных залаў музея, дзе распавядаецца аб акупацыйным рэжыме. Яна не хавае, што часта, расказваючы пра тыя жахі, якія здзяйснялі на нашай зямлі фашысты, цяжка было стрымаць слёзы.

— Вельмі складана прывыкнуць расказваць пра вайну, — прызнаецца загадчыца аддзела. — Наш музей заўсёды быў на вяршыні папулярнасці: каб даведацца ўсю праўду аб тых падзеях, людзі ехалі ў Беларусь. У той час іх цікавіла тэма гераізму савецкага народа, і менш за ўсё мы гаварылі аб акупацыі. Былі тэмы, пра якія ўвогуле доўгі час не прынята было казаць: прымусовая праца грамадзянскага насельніцтва, калабарацыя, ваеннапалонныя... Цяпер жа ўсё змянілася: адкрыліся архівы, адбыўся інфармацыйны прарыў — людзі пачалі глыбока вывучаць тэму вайны.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

22 кастрычніка 2021 г. № 41 (626)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ

**НАТАЛЛЯ КАЧАНАВА:**

## «Мы павінны цаніць мір, спакой і магчымасці, якія ёсць у кожнага для рэалізацыі ў сваёй краіне»

**У вялікім інтэрв'ю для тэлеканала АНТ спікер Савета Рэспублікі расказала аб фактарах кансалідацыі беларускай нацыі, рабоце над змяненнямі ў Асноўны Закон краіны і адказе заканадаўцаў на санкцыйны ціск Захаду.**

стар. 8

КОНКУРС

# «ХІТ-ПАРАД» НАРОДНЫХ ІНІЦЫЯТЫЎ



Удзельнік Маладзёжнага савета пры Гомельскім раённым Савеце дэпутатаў Станіслаў СЯМЁНАЎ – актывіст грамадскай ініцыятывы па добраўпарадкаванні п. Юбілейны.



Правядзенне Дня двара — адна з папулярных ідэй гамяльчан. Конкурс ініцыятыў дапаможа падрыхтаваць базу для актыўнага адпачынку.



Ініцыятыўная моладзь п. Юбілейны добраўпарадкоўвае вадаём.

**Конкурс грамадзянскіх ініцыятыў абвешчаны на Гомельшчыне. Яго пераможцы атрымаюць фінансавую падтрымку ў ажыццяўленні самых яркіх праектаў з сацыяльным, эканамічным і экалагічным эфектам.**

Гэта першы падобны конкурс у рэгіёне. Ён накіраваны на падтрымку актыўнасці грамадзян у вырашэнні сацыяльна значных пытанняў на мясцовым узроўні. Арганізатарам конкурсу выступае Гомельская абласная асацыяцыя мясцовых Саветаў дэпутатаў.

— Сёння грамадзянскія ініцыятывы, накіраваныя на паляпшэнне якасці жыццядзейнасці насельніцтва на адпаведнай тэрыторыі, на добраўпарадкаванне населеных пунктаў, актыўна падтрымліваюцца. Абвешчаны конкурс закліканы ў тым ліку стымуляваць жыхароў нашага рэгіёна да ўключэння ў падобную сацыяльна значную дзейнасць, — заўважыла **старшыня праўлення Гомельскай абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў, старшыня Гомельскага раённага Савета дэпутатаў Вікторыя ЛАДУЦЬКА**. — Прадставіць свой праект для ўдзелу ў конкурсе можа ініцыятыўная група не менш як з пяці чалавек. Удзельнікамі могуць выступіць людзі рознага роду заняткаў, якія ажыццяўляюць заяўленую ініцыятыву цалкам або часткова, а таксама юрыдычныя асобы. Патрабаванне да складу ініцыятыўнай групы — грамадзяне, якія пражываюць на тэрыторыі аднаго сельсавета або населенага пункта.

Як падкрэслілі ў абласной асацыяцыі, да ўдзелу ў конкурсе дапусцяць праекты пасля папярэдняй ацэнкі.

— Будзе ўлічвацца актуальнасць прапанаванай ініцыятывы, прадуманасць і паслядоўнасць дзеянняў па яе рэалізацыі, чаканы сацыяльны, эканамічны і экалагічны эфект, устойлівасць і развіццё атрыманых вынікаў, — дадала Вікторыя Ладуцька. — Пакет дакументаў для ўдзелу ў конкурсе неабходна даслаць заказным пісьмом з паведамленнем або даставіць кур'ерам на адрас у Гомелі: вуліца Ільіча, 51А, кабінет 213, — ці на электронны адрас Гомельскага раённага Савета дэпутатаў.

Конкурс грамадзянскіх ініцыятыў — адзін з першых сацыяльна значных праектаў Гомельскай абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў, заснаванай летам бягучага года ў Гомелі абласным, гарадскім і раённымі Саветамі дэпутатаў.

— Гэта новая некамерцыйная арганізацыя заклікана каардынаваць дзейнасць Саветаў дэпутатаў у сферы развіцця мясцовага самакіравання, аказваць метадычную дапамогу мясцовым Саветам па пытаннях мясцовага самакіравання, узаемадзеяння з рознымі дзяржаўнымі органамі, юрыдычнымі і фізічнымі асобамі. Важнымі інструментамі ў рабоце асацыяцыі стануць тэматычныя мерапрыемствы, да ўдзелу ў якіх плануецца прыцягваць вучоных і галіновых спецыялістаў, што паспрыяе абмену вопытам і ведамі, неабходнымі дэпутатам у рабоце на мясцовым узроўні, — падкрэсліла суразмоўніца.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА, фота аўтара.**

ФОРУМ

# Па кроках да ўстойлівага развіцця

**На Гомельшчыне падводзяць вынікі рэгіянальнага форуму па ўстойлівым развіцці — усе яго 17 Мэт паспяхова рэалізоўваюцца ў вобласці. Да таго ж значная колькасць праектаў паўднёва-ўсходняга рэгіёна ўносяць грунтоўны ўклад у эканоміку краіны.**

Амаль два дзясяткі экспертных дакладаў у анлайн- і афлайн-фармаце прадставілі ўдзельнікі форуму — прадстаўнікі органаў улады, адказных ведамстваў, навучальных устаноў і грамадскіх арганізацый. Да ўдзельнікаў па відэасувязі з Мінска звярнуўся нацыянальны каардынатар па дасягненні Мэт устойлівага развіцця, **намеснік Старшыні Савета Рэспублікі Анатоль ІСАЧАНКА**.

— Наш народ ведае, чаго вартыя такія каштоўнасці, як мір і спакой. Мы змаглі сфарміраваць нацыянальную мадэль, якая абараняе інтарэсы простага чалавека. Нягледзячы на выклікі — беспрэцэдэнтны знешні ціск на Беларусь, спробы ўмяшання — пытанні стварэння камфортных умоў для нашых грамадзян працягваюць заставацца прыярытэтнымі. І ў буйным абласным цэнтры, і ў невялікім пасёлку кожны беларус павінен мець камфортныя ўмовы пражывання. Важна стварыць развітую сацыяльную інфраструктуру, — адзначыў ён.

Як было сказана, Гомельшчына мае відавочныя дасягненні ў рэалізацыі Мэт устойлівага развіцця — робіць значны ўнёсак у развіццё эканомікі, сацыяльнай сферы і экалогіі краіны. Дарэчы, у структуры рэспубліканскіх аб'ёмаў прамысловасці, сельскай гаспадаркі, гандлю і іншых паказчыкаў паўднёва-ўсходні рэгіён займае ад 15-20. Актыўна развіваецца сацыяльная сфера. Сярод новых сацыяльна значных аб'ектаў — школы ў Гомелі, сучасны дзіцячы садок у Мазыры, абсталяваная па апошнім слове тэхнікі дзіцячая абласная бальніца, цэнтральная гарадская паліклініка, аддзяленне рэабілітацыі ў Гомельскім доме-інтэрнаце для дзяцей-інвалідаў.

— Абмен вопытам — важны элемент кансалідацыі паспяховых прыкладаў і практык, якія ў далейшым могуць быць інтэграваныя ў рэгіянальныя стратэгіі развіцця з улікам лакальных асаблівасцяў і прыярытэтаў, — адзначыў **намеснік кіраўніка рэгіянальнай групы па ўстойлівым развіцці, намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Уладзімір ПРЫВАЛАЎ**. — Дасягненне ўстойлівага эканамічнага росту, фарміраванне здаровага ладу жыцця, укараненне рацыянальных мадэляў вытворчасці і спажывання — прыярытэтныя задачы, якія неабходна сумесна вырашаць.

Між тым, значная ўвага ў рабоце форуму была аддадзена абмеркаванню праектаў развіцця тэрыторый, пацярпелых у выніку катастрофы на ЧАЭС. Сёння на Гомельшчыне рэалізоўваецца шостая рэспубліканская праграма:

— Калі першая праграма больш датычылася аднаўлення тэрыторый, цяпер у прыярытэце — іх сацыяльна-эканамічнае развіццё. Грошы ўкладаюцца ў вытворчыя аб'екты, будаўніцтва жылля, правядзенне газаправода, развіццё інжынерна-транспартнай і сацыяльнай інфраструктуры. Гэта спрыяе стварэнню новых рабочых месцаў і агульнаму паляпшэнню стану эканомікі дадзеных раёнаў. У гэтым напрамку мы маем намер рухацца і далей, — акцэнтаваў увагу **начальнік упраўлення жыллёва-камунальнай гаспадаркі і па праблемах ліквідацыі наступстваў катастрофы на ЧАЭС Гомельскага аблвыканкама Дзмітрый РУТКОЎСКІ**.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

# «Мы павінны цаніць мір, спакой і магчымасці, якія ёсць у кожнага для рэалізацыі ў сваёй краіне»

### Самае важнае ў жыцці кожнага

***— Тыдзень выдаўся асаблівым, такім яго робіць Дзень Маці, які вельмі шырока адзначалі сёлета, яшчэ Еўразійскі жаночы форум, у якім вы бралі ўдзел. Па праўдзе сказаць, гучыць ён дастаткова вузка — жаночы форум, — але тэмы, якія вы ўзнімалі, нашмат шырэйшыя, чым пытанні еўразійскага рэгіёна. Што для нас значыць гэты фармат, улічваючы, што сёння існуе дастаткова пляцовак, на якіх мы можам тыя ж пытанні ўзнімаць?***

— Ведаеце, на жаль, сёння не так шмат пляцовак, на якіх мы можам паднімаць такія пытанні ў рэжыме рэальнага часу, я маю на ўвазе ў вочным фармаце. Таму што мы, парламентарыі і члены Савета Рэспублікі, шмат звярталіся да сваіх калег, каб яны пачулі, што адбываецца ў нашай краіне, але не вельмі жадаюць чуць. А гэтая пляцоўка, на мой погляд, выдатная. Мне давялося быць на першым еўразійскім форуме ў Санкт-Пецярбурзе, які адбыўся ў 2015 годзе (ініцыятыва яго правядзення належыць Валянціне Іванаўне Мацвіенцы), і сёння гэта ўжо глабальны жаночы рух.

> Перш чым вынесці на рэферэндум абноўленую Канстытуцыю, яна будзе абмяркоўвацца народам і гэтая работа будзе разгорнута шырокамаштабна.

Сёлета адбыўся ўжо трэці форум, у якім брала ўдзел вялікая колькасць удзельніц (прадстаўніц 110 краін з усіх рэгіёнаў планеты) — і, ведаеце, заўсёды атрымліваецца дастаткова адкрытая і сумленная размова. Я хачу шчыра сказаць, там мы адчуваем сябе сапраўды сяброўкамі. Калі мы знаходзім агульную мову па тых праблемах, якія хвалююць прадстаўніц розных краін. Я была задаволеная тым, што мне давялося выступіць на пленарным адкрыцці гэтага жаночага форуму і даведці інфармацыю аб нашай краіне, якую я хацела б, каб пачулі жанчыны ўсіх краін свету.

***— Пра санкцыі казалі?***

— Там няма тэм, якія б не закраналіся жанчынамі ўсяго свету. Таму што вы бачыце, сітуацыя ў розных краінах вельмі розная. І сёння нас, жанчын, не можа не хваляваць тое, што з'яўляецца, на жаль, шмат гарачых пунктаў на планеце, ёсць нераўнапраўе, выкарыстоўваецца дзіцячая праца, гендарная няроўнасць, топчуцца правы жанчын. І аб гэтым кажуць жанчыны сур'ёзна, гучна і заяўляюць аб гэтым на ўвесь свет.

У 2015-м адбыўся першы форум, і, напэўна, павінны сыходзіць нейкія праблемы. Аднак з'яўляюцца новыя выклікі і пагрозы, якія хвалююць нас, жанчын. А жанчына — гэта захавальніца ачага, маці, чалавек, які перажывае за ўсё. Таму што кожны раз прапускаеш праз сябе праблемы, якія існуюць: і там, дзе галадаюць людзі, і там, дзе ідзе вайна і гінуць дзеці, жанчыны, мірныя людзі. Прапускаючы праз сябе гэтыя праблемы, кожны раз задумваешся: што самае галоўнае ў жыцці для кожнага чалавека? І разумееш, што мір і спакой — самае важнае. Вядома, рэалізацыяй тых магчымасцяў, якія сёння ёсць у нашай краіне, мы па праве можам ганарыцца.

### Заклік да санкцый супраць свайго народа — вар'яцтва

***— Калі працягваць тэму санкцый: яна сапраўды ўсёабдымная — мы разумеем, што няма сёння дзяржавы, супраць якой гэтыя рэжымы б не выкарыстоўваліся. З пункту гледжання заканатворчасці: ці ёсць у нас што супрацьпаставіць і адказаць Захаду?***

— Мы разумеем, што павінны дзейнічаць на апярэджанне: усе законапраекты павінны быць сённяшняга дня, па якіх законах жыве наша краіна, наша прававая дзяржава (і пра гэта напісана ў Асноўным Законе нашай краіны — Канстытуцыі). Але разам з тым мы павінны бачыць, якія законапраекты нам яшчэ патрэбныя, якія пытанні яшчэ заканадаўча не ўрэгуляваны, і, вядома, улічваць усе рэаліі сучаснасці, несумненна, маніторыць сітуацыю ў свеце, бачыць, што адбываецца ўнутры нашай краіны і прымаць абсалютна адэкватныя законапраекты, якія будуць неабходныя для народа і краіны.

Безумоўна, мы ўлічваем усе праблемы, што існуюць сёння і не могуць не хваляваць: гэта санкцыі ў адносінах да нашай краіны. Па сутнасці, разгорнута гібрыдная вайна, якая, можа, крыху сціхла, але разам з тым метады яе радыкалізуюцца (гэта экстрэмізм — мы аб гэтым можам казаць сёння, на жаль). Таму зусім нядаўна на адкрыцці сесіі Савета Рэспублікі мы разглядалі шэраг пытанняў і адно з іх — прыпыненне дзеяння дамовы паміж Беларуссю і Еўрасаюзам аб рэадмісіі асоб, якія не маюць грамадзянства.

Цяпер падрыхтаваны змяненні і дапаўненні ў Крымінальны кодэкс аб адказнасці за заклікі да санкцый. Гэта будзем таксама разглядаць самым сур'ёзным чынам, бо гэта бязладдзе, калі да санкцый заклікаюць нашы былыя суайчыннікі, разумеючы, што санкцыі будуць накіраваны супраць кожнага чалавека ў нашай краіне. Гэта не паддаецца аніякаму асэнсаванню і чалавечай логіцы. На мой погляд, гэта нейкае вар'яцтва. Таму людзі, якія заклікаць да санкцый супраць свайго народа і краіны, павінны несці за гэта адказнасць.



### Абмеркаванне навел Канстытуцыі ў грамадстве будзе шырокамаштабным

***— Мы загаварылі пра Канстытуцыю: сапраўды, цяпер ідзе сур'ёзная заканатворчая работа, і ў першую чаргу, падрыхтоўка да абмеркавання, а потым — прыняцця новай Канстытуцыі. Як вы бачыце гэты працэс?***

— Мы не першы год казалі пра гэта: так, сапраўды, час ідзе, змяняюцца многія падыходы ў рэаліях нашага жыцця, і работа над Асноўным Законам нашай краіны — Канстытуцыяй — тэма, якая не ўзнікла летась. Пра гэта мы казалі яшчэ некалькі гадоў таму, і ёю трэба займацца...

> Мы павінны вызначыць для сябе асноўныя прыярытэты свайго жыцця: камусьці найперш — матэрыяльны дабрабыт, хтосьці жадае рэалізавацца ў прафесіі, нехта — у сям'і. Але ў нас павінна быць асноўнае — любоў да сваёй краіны, сваёй Радзімы, сваёй сям'і — гэта тыя змацаванні, якія павінны нас аб'ядноўваць.

***— То-бок не імем рэвалюцыі, а планавая работа?***

— Вядома! Гэта была планавая работа. Калі памятаеце, яшчэ працуючы ў Адміністрацыі Прэзідэнта, мы пра гэта казалі, казаў пра гэта Прэзідэнт нашай краіны, і мы разумелі, што трэба пачынаць, бо ёсць пытанні, якія трэба было вырашаць нават тэхнічна. Але потым пандэмія змяніла гэтыя планы, але мы разумелі, што будзем працаваць над Асноўным Законам нашай краіны. Была створана Канстытуцыйная камісія, удзел у рабоце якой бяруць сенатары, мы прадставілі на разгляд кіраўніку дзяржавы праект, але ж гэта не канчатковы варыянт. Яшчэ ідзе работа над Асноўным Законам, і, больш за тое, хачу сказаць: мы, выязджаючы ў рэгіёны, сустракаючыся з людзьмі, чуем прапановы, якія агучваюць людзі.

***— Я папрашу тут растлумачыць, таму што вы, напэўна, чытаеце апанентаў Канстытуцыйнай камісіі, якія кажуць аб тым, што цяпер камісія пры-ме, Прэзідэнт падпіша і без усялякага абмеркавання мы спакойна прыйдзем у дзень галасавання.***

— Не, канешне! Выязджаючы ў рэгіёны і сустракаючы з людзьмі, мы ўжо пра гэта кажам. Зусім нядаўна, у суботу (9 кастрычніка. — **Заўв. аўт.**), я сустракалася са студэнтамі Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта і казала пра навацыі, якія агучыла Канстытуцыйная камісія зыходзячы з прапаноў, што паступалі не толькі ад членаў Канстытуцыйнай камісіі, але на дыялогавых пляцоўках, грамадскіх прыёмных, ад святароў (праваслаўная царква, дарэчы, некалькі разоў уносіла розныя прапановы па дапаўненнях у Канстытуцыю). Гэта значыць, удзельнічаюць шырокія слаі насельніцтва. А тое, што гэта будзе абмяркоўвацца ў грамадстве, — у гэтым няма нават ніякага сумнення. Перш чым вынесці на рэферэндум абноўленую Канстытуцыю, яна будзе абмяркоўвацца народам і гэтая работа будзе разгорнута шырокамаштабна. Мы разумеем, што будзем з'яўляцца праваднікамі: члены Канстытуцыйнай камісіі з ліку членаў Савета Рэспублікі будуць вельмі актыўна працаваць, каб данесці навелы, прапанаваныя ў новым праекце Канстытуцыі.

### Мы — розныя, але ў нас ёсць фундамент

***— Сёлета мы ўпершыню адзначылі Дзень народнага адзінства і бачым, што ў грамадстве адчуваецца напружанасць, ёсць чаканне, што з'явіцца аб'яднальны фактар, якога многім не хапае. У гэтым сэнсе, на ваш погляд, што б магло стаць такім цэментавальным фактарам?***

— Ведаеце, з аднаго боку, вельмі проста адказаць на ваша пытанне, з другога — яно дастаткова філасофскае. Я мяркую, што для кожнага паняцце аб'яднання, адзінства, напэўна, можа ўспрымацца па-рознаму, але мне бачыцца, што ў нашай краіне дасягнуць гэтага на самай справе не так складана. Растлумачу, чаму. Па-першае, трэба задумацца і паглядзець на гісторыю сваёй краіны. Згадаць, як сто гадоў таму нашу Беларусь разарвалі жыўцом (нездарма мы святкуем Дзень народнага адзінства 17 верасня), потым пачалася Другая сусветная вайна... Паглядзець на ўсе падзеі, што адбываліся з краінай нават на працягу гэтага стагоддзя — і калі ты прасякнешся яе гісторыяй, будзеш дакладна ўсведамляць: беражы тое, што маеш.

Па-другое. Мне здаецца, што нашы людзі дастаткова разумныя. Беларусы — мудрыя людзі, як бы ні казалі, што мы розныя. Зразумела, розныя, але, па вялікім рахунку, розум заўсёды павінен перамагчы. Мы павінны вызначыць для сябе асноўныя прыярытэты свайго жыцця: камусьці найперш — матэрыяльны дабрабыт, хтосьці жадае рэалізавацца ў прафесіі, нехта — у сям'і. Але ў нас павінна быць асноўнае — любоў да сваёй краіны, сваёй Радзімы, сваёй сям'і — гэта тыя змацаванні, якія павінны нас аб'ядноўваць, бо не можа быць, каб вы ці я былі супраць міру ў нашай краіне? Вядома, не! Прыклады — Афганістан, Сірыя, іншыя гарачыя пункты планеты, дзе сёння проста немагчыма жыць, не кажучы аб тым, каб вучыцца, атрымліваць адукацыю, працаваць. І я ўпэўненая, калі кожны добра падумае аб гэтым, ён будзе разумець: трэба берагчы тое, што мы маем, і ганарыцца сваёй краінай, умець вылучаць галоўнае ў жыцці.

Нас павінна аб'ядноўваць наша гісторыя — наш фундамент. Ведаеце, многія кажуць: «Так атрымалася, штосьці мы ўпусцілі, дзесьці мы недапрацавалі», але трэба глядзець унутр сябе, разумееце. А калі ўзяць 30 гадоў, па вялікім рахунку — не такая вялікая гісторыя ў нашай незалежнай суверэннай краіны, але якая яна сёння! Мы ўсе ёю ганарымся без выключэння. Ведаеце, добра там, дзе нас няма, так кажуць. Адзінства і тое, што нас павінна аб'ядноўваць, — гэта наша слаўтая гісторыя і тое, што мы зрабілі за гады незалежнасці. Наш народ усё выдатна разумее. І мы павінны цаніць мір, спакой і магчымасці, якія ёсць у кожнага з нас для рэалізацыі ў сваёй роднай краіне, на сваёй роднай зямлі.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)*

Сядзі і глядзі

# КІНАКЛАСІКА ВІКТАРА ТУРАВА

**25 кастрычніка спаўняецца 85 гадоў з дня нараджэння славутага беларускага кінарэжысёра, сцэнарыста і педагога, народнага артыста СССР Віктара Турава. З нагоды памятнай даты тэлеканал «Беларусь 3» падрыхтаваў рэтраспектыву знакавых гульнявых стужак майстра.**

Аўтар звыш дваццаці кінематаграфічных праектаў, экранізацый класікаў беларускай і рускай літаратуры, Віктар Тураў пачаў прафесійны шлях у 1959 годзе на кінастудыі «Беларусьфільм», дзе з цягам часу стварыў большасць сваіх знакамітых работ. У 1965-м, з выхадам на экраны яго першага поўнага метра — «Цераз могілкі» пра асаблівы падыход самабытнага выпускніка творчай майстэрні Аляксандра Даўжэнкі да раскрыцця тэмы партызанскага супраціву загаварылі на міжнародным узроўні. Дагэтуль дыпломную стужку Віктара Турава кінакрытыкі і профільныя выданні лічаць адной з найважнейшых у сусветным кінапрацэсе. Ужо праз год рэжысёр прадставіў свой другі поўны метр — «Я родам з дзяцінства», які больш за паўвека таксама застаецца прызнанай вяршыняй беларускага кіно. Глыбокі псіхалагізм работ Віктара Турава быў яго візітоўкай на працягу ўсіх дзесяцігоддзяў насычанай творчай дзейнасці, якая падарыла свету шмат цікавых мастацкіх кінадаследаванняў эпізодаў Вялікай Айчыннай вайны, сацыяльных і духоўных праблем сучаснасці. Апошнія гады жыцця майстар на пасадзе прафесара Беларускай акадэміі мастацтваў прысвяціў прафесійнаму выхаванню маладога пакалення рэжысёраў. Сёння, акрамя вучняў Віктара Цімафеевіча, кінематаграфічную дзейнасць паспяхова працягвае і яго дачка Алена Турава.

Спецыяльна да дня нараджэння Віктара Турава тэлеканал «Беларусь 3» прадставіць з 25 да 29 кастрычніка ў 13.15 і 21.05 пяць яскравых работ майстра з залатога фонду Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм». Зможам убачыць культавыя стужкі «Цераз могілкі» і «Я родам з дзяцінства», дылогію «Партызаны»: частку першую — «Вайна пад стрэхамі» і частку другую — «Сыны ідуць у бой», і адзін з апошніх фільмаў Віктара Цімафеевіча — «Чорны бусел». А распачнецца рэтраспектыва паказам дакументальнага біяграфічнага тэлефільма Белтэлерадыёкампаніі «Майстар. Рэжысёр Віктар Тураў».

**Алена ДРАПКО.**

## ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 131

Сваю новую задачу даслаў наш чытач Павел Задаяны з Брэста (гл. дыяграму).



**Белыя:** Кра5, Лd7, Ле7, Са1, Сс2, Ке6, пh4 (7).

**Чорныя:** Крf5, Фd3, Лg3, Ch6, пп. f4, g4, h7 (7).

Мат за 2 хады.

Прапануем чытачам гэтую задачу для самастойнага рашэння. Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі (вул. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск, «Звязда») або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

* * *

Дзве свае пазіцыі для пачаткоўцаў прапануе Сяргей Дарошчанка.

**№ 1**

**Белыя:** Кре7, Лb1, Лh2, Се2, Kb7 (5).

**Чорныя:** Кра4, Ке6, пп. а3, а5, с3, d3, e4, f4, g5 (9).

Мат за 2 хады.

**№ 2**

**Белыя:** Крb1, Фg3, Ле1, пп. а2, b2, c2, d3 (7).

**Чорныя:** Крb8, Фd7, Лf6, пп. а7, b7, c7, d6 (7).

Выйгрыш.

* * *

Да ўвагі аматараў шахмат. Яшчэ тры партыі сёлетняй сусветнай анлайн-алімпіяды, якія скончыліся перамогай нашых суайчыннікаў.

Дзяніс Лазавік — Эргіт Рамай. 1. d4 f5 2. Kf3 Kf6 3. g3 g6 4. Cg2 Cg7 5. 0-0 0-0 6. b3 d6 7. Cb2 Ка6 8. c4 c5 9. d5 Cd7 10. Kc3 Ke4 11. Фс1 K:c3 12. C:c3 b5 13. C:g7 Кр:g7 14. Фс3+ Крg8 15. e4 fe 16. Kd2 bc 17. bc e3 18. Ф:e3 Kb4 19. Фс3 Cf5 20. Ce4 Фd7 21. Лfe1 C:e4 22. Л:e4 Фf5 23. a3 Ка6 24. Лf1 Лf7 25. Фа5 Фс8 26. Лfe1 Фf5 27. Лf4 Фс8 28. Л:f7 Кр:f7 29. Ke4 h6 30. Фd2 Крg7 31. Фс3+ Крf7 32. Фе3 Крg7 33. Kc3 Фf5 34. Ф:e7+ Фf7 35. Ф:d6 Лf8 36. Ле7, 1:0.

Спенсер Масанга — Аляксей Аляксандраў. 1. Kf3 Kf6 2. d4 d5 3. c4 e6 4. g3 dc 5. Cg2 Kc6 6. 0-0 Лb8 7. a4 a6 8. b3 cb 9. Ф:b3 Ce7 10. e3 0-0 11. Kc3 b6 12. Лd1 Cb7 13. Ca3 Ka5 14. Фс2 C:a3 15. Л:a3 Фе7 16. Лаа1 c5 17. Лab1 cd 18. Л:d4 Фс5 19. Фb2 Лfc8 20. Ke2 Kc4 21. Фb4 Ce4 22. Ф:c5 Л:c5 23. Лbd1 Крf8 24. Kd2 K:d2 25. Л1:d2 C:g2 26. Кр:g2 Кре7 27. Лb2 e5 28. Лdb4 Kd5 29. Л4b3 a5 30. Лd2 Kb4 31. Kg1 f6 32. Kf3 Лbc8 33. Kh4 g6 34. Лb1 Лc1 35. Лbb2 Л8c2 36. Kf3 Л:b2 37. Л:b2 Лc2 38. Лb3 Крd6 39. Ke1 Ла2 40. Kd3 Л:a4 41. Kb2 Ла2 42. Kc4+ Крс5 43. Лс3 Лс2, 0:1.

Аляксандра Тарасенка — Нікаліна Колievіч. 1. d4 Kf6 2. c4 e6 3. Kc3 Cb4 4. Kf3 d5 5. e3 0-0 6. a3 C:c3+ 7. bc Kbd7 8. Cd3 c6 9. 0-0 Фс7 10. Фс2 e5 11. e4 de 12. C:e4 K:e4 13. Ф:e4 Ле8 14. Cg5 f6 15. Ch4 b6 16. Cg3 Cb7 17. c5 bc 18. de K:e5 19. C:e5 fe 20. Kg5 g6 21. Фс4+ Крh8 22. Лad1 Фе7 23. Kf7+ Крg7 24. Kd6 Лf8 25. Ф:c5 Ca6 26. Kf5+ Крf6 27. Ф:e7+, 1:0.

* * *

У Мінску адбыўся турнір, прысвечаны прафесійнаму святу педагогаў. Сярод больш чым 40 удзельнікаў былі 2 гросмайстры і 7 майстроў ФІДЭ. Першыя два месцы занялі адпаведна Мікіта Маёраў і Арцём Бляўскі — па 8 балаў з 10. Трэці — Максім Царук (7,5).

На Мемарыяле Аляксандра Панчанкі ў Чэлябінску (147 удзельнікаў) Аляксей Фёдараў заняў 7-е месца, Сяргей Азараў — 11-е, Аляксей Аляксандраў — 16-е, Дзяніс Лазавік — 18-е, Міхаіл Нікіценка — 22-е, Вячаслаў Зарубіцкі — 23-е.

У анлайн-турніры па бліцы на сайце chess.com (516 удзельнікаў) Сяргей Жыгалка фінішаваў адзінаццаты, Дзяніс Лазавік — дваццаць дзявяты.

* * *

Задача з мінулага выпуску рашаецца 1. Kh1. Першыя правільна адказалі Міхаіл Кошаль, Дзяніс Лазюта, Васіль Жуковіч, Фёдар Карпей, Сяргей Цяльпук, Віктар Жук.

**Вадзім ЖЫЛКО.**





ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Друкуецца ў «Алесі»

# Пра што расказваюць «узоры» на руках?

### Самае цікавае ў свежым нумары часопіса

**Напэўна, многія з вас хоць бы аднойчы ў жыцці, хай нават дзеля цікавасці, варажылі па руцэ. Вядома, усе чулі пра дактыласкапію, якая дазваляе па адбітках пальцаў знайсці злачынца. А вось што такое дэрматагліфіка? Чым яна адрозніваецца ад хіраманты? Ці можна па руцэ «вылічыць» прафесійныя, злачынныя схільнасці, стан здароўя, поспехі і няўдачы ў любоўных адносінах? Пра ўсё гэта ў кастрычніцкім нумары часопіса «Алеся» расказвае хірамант Сяргей САВОСЬКІН.**



Найчасцей людзі, што прыходзяць да такога спецыяліста, задаюць пытанні наконт асабістага жыцця. Зразумела, што колькасць шлюбаў нельга прадказаць, а вось сарыентаваць, які тып адносін больш падыходзіць для шчаслівага шлюбу, можна. Ці вялікая верагоднасць памылак у «чытанні» па руцэ? Заўсёды ёсць рызыка ўпусціць нейкі важны нюанс і зрабіць няправільную выснову. Але асноўная праблема — разуменне паміж хірамантам і яго госцем. Многія фармулёўкі і простыя рэкамендацыі для іншага чалавека раптам набываюць двухсэнсоўнасць і тлумачацца па-свойму, зусім не так, як пра тое кажа хірамант. Гэтае няўменне слухаць і аналізаваць інфармацыю найбольш засмучае.

## АДНОСІНЫ НА МЯЖЫ КАНФЛІКТУ

Сяброўства свякрухі і нявесткі — з шэрагу цудаў, пра якія чуеш, але, на жаль, вельмі рэдка сустракаеш у рэальным жыцці. Парады пра тое, як наладзіць добрыя адносіны і не псаваць жыццё мужчыну, якога абедзве жанчыны шчыра любяць, дае псіхолаг **Таццяна Шаранда**.



Калі нявестка і свякроў з самага пачатку не паладзілі, адзінае выйсце — мінімізаваць кантакты, сустракацца толькі па меры неабходнасці. Жыць маладой сям'і сёння ў любым выпадку лепш асобна, нават калі няма сварак. Дзве жанчыны на адной кухні — гэта выбуханебяспечная сітуацыя, якой трэба ўсяляк пазбягаць. Калі маці зацікаўленая ў сямейным шчасці сына, яна зможа нават чымсьці ахвяраваць і выбудаваць правільную лінію паводзін. Козыр нявесткі — маніпуляваць унукамі, але мудрая свякроў не стане ўключацца ў гэтыя «гульні»...

## А Я ЛЮБЛЮ ЖАНАТАГА

*«Кіно і жыццё часам цесна пераплятаюцца. Я закахалася ў жанатага мужчыну. І далей усё па вядомым сцэнарыі: нарадзіла дзіця, ад якога мой мужчына адмовіўся яшчэ да нараджэння. У самым страшным сне не магла ўявіць, што апынуся ў такой*



*сітуацыі, але менавіта так і здарылася — усё як у кіно...»* На пісьмо чытачкі «Алесі» адказвае адвакат Мінскай абласной калегіі адвакатаў **Таццяна Сямешка**.

Існуе судовы і пазасудовы парадак вырашэння той няпростай жыццёвай сітуацыі, у якой апынулася чытачка. Частка 3 арт. 57 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб шлюбе і сям'і вызначае кола асоб, якія маюць права звярнуцца ў суд для вырашэння пытання аб устанаўленні бацькоўства. Імі з'яўляюцца: адзін з бацькоў дзіцяці, апякун, папячыцель дзіцяці, а таксама само дзіця па дасягненні ім паўналецця. Важна ведаць, што на патрабаванні аб устанаўленні бацькоўства не распаўсюджваецца іскавая даўнасць; гэта значыць, зацікаўленая асоба мае права звярнуцца ў суд з іскам незалежна ад часу, які прайшоў з моманту, калі ў яго з'явіліся падставы для падобнага звароту.

## ВАЛАСЫ ВЫПАДАЮЦЬ АД... СТРЭСУ



*Часопіс Nature нядаўна апублікаваў даследаванне аб тым, як хранічны стрэс уплывае на прыгажосць прычоскі. Штуршком стала пандэмія COVID-19. Аказалася, што прыкладна чвэрць тых, хто перахварэў на каранавірус, мае страту валасоў. Аднак падчас даследаванняў спецыялісты прыйшлі да высновы, што звязана гэта не з уздзеяннем самога віруса, а з нервовым напружаннем, якое суправаджае хваробу.*

Звычайна мы не звяртаем увагі на страту валасоў, бо на іх месцы з'яўляюцца новыя. Але раптам вашы валасы станчаюцца і радзеюць! Прычынамі, акрамя стрэсу, могуць быць лекі з пабочным эфектам, а таксама частыя ўкладкі з лакам. Іншым разам выпадзенне валасоў сведчыць аб праблемах са шчытападобнай залозай.

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** [СЦ], **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 18.15, 1.00** Зона Х (16+).
**9.10** Галоўны эфір.
**10.20** Навіны надвор'я.
**10.45, 12.10, 18.35, 19.20 Драма «У палоне ў мінулага» (16+).**
**13.05, 15.25 Драма «Канюшына жаданняў» (16+).**
**15.10, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** Беларуская часінка.
**21.00** Панарама.
**21.45** Зразумелая палітыка.
**22.00 Серыял «След» (16+).**
**0.45** Арэна.
**1.20** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**6.00** «Уключайся!» (12+)
**9.00, 11.10, 21.05** Тэлебарометр.
**9.05, 19.50** «Зразумець. Даравацъ» (16+).
**10.20** «На тыдзень» (16+).
**11.45 Серыял «Стыч!» (6+)**
**12.05** «Прынцэса і Жаба» (0+).
**13.45** «Усёй сям'ёй» (6+).
**14.45 Камедыя «Гатэль «Мэрыголд»: лепшы з экзатычных» (12+).**
**17.00** «Суперлато».
**17.40** «Багіня шопінгу. Экстрэмальны сезон» (16+).
**18.40** «На кручку» (16+).
**21.10** Спортлато 6 з 49, КЕНА.
**21.15 Серыял «Жаночы доктар-4» (16+).**
**22.20 Серыял «Следчы Гарчакова» (16+).**
**0.40** «Экстрасэнсы-дэтэктывы» (16+).

### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35, 12.20** «Беларуская кухня».
**8.05, 12.00, 19.40, 23.45** Навіны культуры.
**8.25** «Нацыянальны хіт-парад».
**9.20, 18.10 «Двое на востраве слёз». Маст. фільм (16+) [СЦ].**
**10.50** «Кадры жыцця».
**11.45** «Архітэктура Беларусі» [СЦ].
**12.50** «Наперад у мінулае».
**13.15, 22.25** «Майстар. Рэжысёр Віктар Тураў». Дак.фільм.
**14.05, 21.05 «Цераз магілкі». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
**15.30** «Навукаманія» (6+).
**15.55** Канцэрт Руслана Аляхно «За жыццё!»
**17.00** «Архітэктура Беларусі» [СЦ].
**17.15** «Майстры і куміры».
**20.00** «Сваімі словамі».
**20.40** «Калыханка» (0+).
**23.20** «Фарбы памяці» [СЦ].

### Беларусь 5

**7.00** Азбука спорту.
**7.15** Тэніс. WTA. Тэнэрыфэ.
**9.20** Спартыўная гімнастыка. Чэмпіянат свету. Мужчыны.
**11.30** Фігурнае катанне. Гран-пры.
**13.10** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. Агляд.
**14.00** Хакей. КХЛ. «Амур» (Хабараўск) — «Дынама-Мінск».
**16.10** Тэніс. WTA. Кубак Крамля.
**18.20** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд.
**19.20** Хакей. КХЛ. «Авангард» (Омск) — СКА (Санкт-Пецярбург).
**21.55** Фігурнае катанне. Гран-пры.

### АНТ

**6.00, 7.10, 8.10** «Наша раніца».
**7.00, 8.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** [СЦ], **20.30, 1.15** Нашы навіны.
**9.10** Контуры.
**10.10** «Жыць здарова!» (16+)
**11.15** «Модны прыгавор» (6+).
**12.20** «Бесталковыя нататкі» (12+).
**13.15, 23.40 Фільм «Другое жыццё Евы» (16+).**
**15.00** «Давай пажэнімся!» (16+)
**16.20** «Мужчынскае / Жаночае» (16+).
**17.20, 18.20** «На самай справе» (16+).
**18.50** «Няхай гавораць» (16+).
**20.00** Час.
**21.15** «Прапаганда» (16+).
**21.35 Фільм «Алібі» (16+).**

### СТБ

**6.00, 6.40, 7.45** «Раніца СТБ».
**6.30** [СЦ], **7.30** [СЦ], **8.30** [СЦ], **10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**8.40** «Тыдзень».
**10.40, 00.05** «Загадкі чалавецтва з Алегам Шышкіным» (16+).
**11.35** «Як уладкаваны свет» (16+).
**12.35, 21.00** «Самыя шакавальныя гіпотэзы» (16+).
**13.45, 23.20** «Таямніцы Чапман» (16+).
**14.40, 16.50 «Каця». Серыял (16+).**
**18.30** «Па сутнасці».
**20.30, 23.15** «СТБ спорт».
**20.35** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.45** «Міншчына».
**22.00** «Скардзіцца дазваляецца».
**0.55** «Самая карысная праграма» (16+).
**1.50** «Мінтранс» (16+).

### МІР

**5.00, 2.30, 3.15** Мір. Меркаванне (16+).
**5.15, 3.30** «Еўразія. Спорт» (16+).
**5.25, 10.10, 3.40 Серыял «Смерць шпіёнам» [СЦ] (16+).**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 3.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15** «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
**14.10, 18.00** «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.05, 16.20** «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
**17.00** «Міравое пагадненне» (16+).
**19.25** «Гульня ў кіно» (16+).
**20.10** «Слабае звяно» (16+).
**21.15** «Назад у будучыню» (16+).
**22.15 Серыял «Штрафнік» (16+).**
**1.30** «Разам».
**2.45** «Старт-ап па-еўразійску» (16+).
**2.55** Мір. Спорт (16+).
**4.30 Серыял «Смерць шпіёнам. Крым» [СЦ] (16+).**

### РТР—Беларусь

**6.05** «Новая раніца».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Таямніцы Беларусі» (16+).
**12.45** «У людзях».
**13.35** «Плюс мінус».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35 Серыял «Таямніцы следства» (16+).**
**17.15** «60 хвілін» (12+).
**18.30** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір» (16+).
**21.05 Серыял «Медыум» (12+).**
**23.10** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым» (12+).

### НТБ—Беларусь

**6.00** «Астрапрагноз».
**6.05** «Здароўе» (12+).
**7.00** «Маршрут пабудаваны» (12+).
**7.40** Будучыня сёння (12+).
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.25** Пракурорская праверка (16+).
**9.35, 10.25, 13.50 Баявік «Маёр Ветраў» (16+).**



**13.25** Надзвычайнае здарэнне.
**14.55 Серыял «Неадкладнае рэагаванне» (16+).**
**16.20, 19.40, 22.30, 23.30** Сёння. Галоўнае.
**16.30** Гісторыі выратавання (12+).
**16.55** «За гранню» (16+).
**17.50** «ДНК» (16+).
**19.55** «Ты супер!» Новы сезон (6+).
**22.35** «НЗ.by».
**22.55, 23.45 Баявік «Драйв» (16+).**

### 8 канал

**7.00, 14.25, 17.15, 21.05, 00.35** «Надвор'е» + «Эрана».
**7.05, 14.30** Мультпарад (0+).
**7.30, 20.50** «Прыколы 13-й школы» (6+).
**7.35 Серыял «Флэш» (12+).**
**8.20 Серыял «Зорны шлях» (12+).**
**9.00, 14.40 Серыял «Служба выратавання 911» (16+).**
**9.45 Серыял «Японія» (12+).**
**10.50 Баявік «Жалезны чалавек» (12+).**



**12.50 Серыял «Яна напісала забойства» (12+).**
**15.25 Серыял «Чорна-белае каханне» (16+).**
**17.20 Серыял «Тэорыя Вялікага выбуху» (16+).**
**18.00 Серыял «Ланцэт» (16+).**
**18.50 Серыял «Імператрыца» (16+).**
**20.55** «Вечарніца» (0+).
**21.10 Трылер «Апгрэйд» (18+).**
**22.45 Серыял «Страшныя казкі» (18+).**



### ВТБ

**6.05** «Раніца з гумарам» (16+).
**8.05** «Зала чакання» (16+).
**9.00** «Пацяшоба» (0+).
**9.25** «Тры каты» (0+).
**9.50** «Царэўна» (6+).
**10.20** «Рускія не смяюцца» (16+).
**11.25, 1.50** «Проста кухня» (16+).
**12.00** «Галерэя прыгажосці» (16+).
**12.55** «Селапаляцела» (16+).
**14.00** «Робасапіен: перазагрузка» (16+).
**15.45** «Уральскія пельмені» (16+).
**17.25, 20.00** Серыял «Кухня» (16+).
**22.35** «Велабайкі» (16+).
**23.10** «Наш рамонт» (16+).
**0.00** «Кіно ў дэталях» (16+).
**0.55** «Рогаў у справе» (16+).
**2.20** Серыял «Татавы дочкі» (12+).
**3.30** «Даеш моладзь» (16+).
**5.10** «6 кадраў» (16+).

### Культура

**6.30** «Вялікія міфы. Адысея».
**7.05** «Палка-выручалка», «Свята непаслушэнства». Мультфільмы.
**8.15** «Міласцевыя паны». Маст. фільм.
**9.25** «Мы — грамацеі!»
**10.05** «Свой сярод чужых, чужы сярод сваіх». Маст. фільм [СЦ].
**11.40** Лісты з правінцыі [СЦ].
**12.05** Дыялогі пра жывёл [СЦ].
**12.50** Неўскі каўчэг [СЦ].
**13.20** «Абсалютны слых».
**14.00** «Гульня ў бісер».
**14.45** Ілюзіён. «Наш чалавек у Гаване». Маст. фільм.
**16.30** «Карціна свету з Міхаілам Кавальчуком».
**17.10** «Нам дарогі гэтыя забыць нельга...»
**18.35** «Дарогі Анатоля Новікава». Дак. фільм.
**19.30** Навіны культуры.
**20.10** «Вертыкаль». Маст. фільм [СЦ].
**21.25** Гала-канцэрт у Вялікім тэатры да 95-годдзя з дня нараджэння Галіны Вішнеўскай.
**23.05** «Філін і кошачка». Маст. фільм.
**0.40** Дыялогі пра жывёл [СЦ].
**1.25** Шукальнікі.
**2.10** «Перавал». Мультфільм для дарослых.
**2.40** «Першыя ў свеце».

### Настальгія

**6.00** «Да і пасля...» (16+)
**7.00, 8.35, 9.40, 11.40, 13.25, 18.55, 21.40, 1.00, 2.30, 3.40, 5.00** Музычная настальгія (12+).
**7.30, 1.30** Фільм «Усё скончана» (16+).
**9.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00** «Колба часу» (16+).
**11.00, 17.25, 23.25** «Блеф-клуб» (16+).
**12.00** Маст. фільм «Трактарысты» (12+).
**13.55** Фільм «Чатыры інтэрв'ю з зімой» (12+).
**15.00** «Быў час» (16+).
**16.00** Маст. фільм «Добрай ночы!» (16+)
**18.00, 4.00** «Народжаны ў СССР» (12+).
**19.15** «Непагаслае святло» (12+).
**22.00** Маст. фільм «Жанчына для ўсіх» (18 +).
**0.00** «Ялавая субмарына» (16+).

### EuroSport 1

**0.55, 9.30, 21.00** The Minute (16+).
**1.00** Снукер. British Open (6+).
**2.30** Аўтагонкі (16+).
**4.00, 7.30** Снукер. Northern Ireland Open (6+).
**6.00, 17.15, 21.10** Аўтагонкі на вынослівасць (16+).
**9.35, 23.05** Веласпорт. «Тур Ламбардыі». Мужчыны (16+).
**11.30, 19.00, 20.00** Тэлеспорт «Зала славы» (16+).
**12.30** Конны спорт. Кубак свету (6+).
**14.00** Веласпорт. «Парыж — Тур». Мужчыны (16+).
**14.30** Велакрос. Кубак свету. Жанчыны (16+).
**15.40, 16.00** Велакрос. Кубак свету. Мужчыны (16+).
**21.05, 23.00** Навіны (16+).

### Кінакамедыя

**1.10** «Каханне ад усіх хвароб» (16+).
**3.25** «Зачыншчыкі» (16+).
**5.15** «Старскі і Хатч» (12+).
**7.05** «Асляплены жаданнямі» (16+).
**8.45** «Жывёла» (12+).
**10.15** «Чарапашкі-ніндзя» (12+).
**11.55** «Чарапашкі-ніндзя-2: таямніца смарагдавага зелля» (6+).
**13.30** «Чарапашкі-ніндзя-3» (6+).
**15.20** «Прывіды былых сябровак» (16+).



**17.10** «Трынаццаць сяброў Оўшэна» (16+).
**19.30** «50 першых пацалункаў» (16+).
**21.20** «Каханне ад усіх хвароб» (16+).
**23.20** «Лёгкі на ўспамін» (12+).

### ТБ3

**6.00** Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
**8.00** «Улегцы» (12+).
**8.35** «Шляхціц Завальня» (12+).
**10.15, 23.40** «Глядзі сам» (16+).
**10.30** «M & S» (12+).
**11.05** «Без Панікі!»
**11.40** «Балерына» (6+).
**13.15** «Добры дзень з Валерыям» (12+).
**14.10** «Вой, ма-мач-кі!»
**18.35, 5.05** «Дзённік экстрасэнса» (16+).
**19.40** «Шэрлак» (16+).
**21.00** «Тэрмінатар: Судны дзень» (16+).



**23.55** «Перавал Дзятлава: паляўнічыя на праўду» (16+).
**0.30** «Звышнатуральнае» (16+).
**3.20** «Гэта рэальная гісторыя» (16+).
**4.15** «Споведзь экстрасэнса» (12+).

### ТБ1000

**5.00** Каштоўнасці сямейкі Адамс (12+).
**6.15** Прыгажуня і пачвара (12+).
**8.05** Затура: касмічная прыгода (12+).
**10.00** Трансформеры (12+).
**12.50** Трансформеры: помста паўшых (16+).
**15.50** Трансформеры-3: цёмны бок Месяца (16+).
**19.00** Трансформеры: эпоха вынішчэння (12+).
**22.15** Трансформеры: апошні рыцар (12+).
**1.15** Чатыры пёры (16+).
**3.15** Вораг каля брамы (16+).

### ТБ1000 Рускае кіно

**5.30** Мая марачка (12+).
**7.25** Ён — Цмок (6+).
**9.20** Дзікая ліга (12+).
**11.20** Каханне і монстры (16+).
**12.55** All inclusive, або Усё ўключана! (16+)
**14.40, 4.55** Канікулы прэзідэнта (16+).



**16.35** Бой з ценем (16+).
**19.00** Бой з ценем-2: рэванш (16+).
**21.25** Бой з ценем 3D: апошні раўнд (16+).
**23.40** Хардкор (18+).
**1.10** Высоцкі. Дзякуй, што жывы (16+).
**3.15** Галасы вялікай краіны (6+).

### National Geographic

**6.00, 6.45, 9.15** Гульні розуму (16+).
**6.20** Зрабіць за адзін дзень (16+).
**7.10, 7.35, 8.50** Фабрыка ежы (16+).
**8.00, 9.45** Царства мумій (16+).
**10.35, 11.25** Скарбы Тутанхамона (16+).
**12.15, 13.10, 14.00** Паранармальныя (16+).
**14.55, 15.50, 4.20, 5.10** Рэальнасць ці фантастыка? (16+)
**16.45** Сакрэтныя матэрыялы старажытнасці (16+).
**17.35, 18.25** У пошуках праўды (16+).
**19.20** Таемная гісторыя (16+).
**20.10, 21.00, 21.50** Дзікі тунец: найлепшае (16+).
**22.40, 23.35, 00.25** НЛА над Еўропай (16+).
**1.15, 3.35** Аўта-SOS (16+).
**2.00, 2.45** Асушыць акіян (16+).

### Discovery

**8.00, 20.20, 20.45, 7.35** Як гэта зроблена? (12+)
**8.25, 8.50, 9.20, 9.45, 10.15, 10.40, 19.25, 19.50** Як гэта ўладкавана? (12+)
**11.10, 12.05** Выбуховае шоу (16+).
**13.00** Астранаўты-аматары (12+).
**13.55** Як уладкаваны Сусвет (12+).
**14.50, 15.15, 15.45, 16.10** Кафэ, закусачныя і забягалаўкі (12+).
**16.40** Голыя і напалоханыя XL (16+).
**18.30** Паляўнічыя на дыназаўраў (12+).
**21.15** Аляска: сям'я з лесу (16+).
**22.10** Аляска: апошні рубеж (16+).
**23.05** Сталёвыя хлопцы (16+).
**0.00** Паляўнічыя на старызну (12+).
**0.55** Металаломшчыкі (16+).
**1.50, 2.15** Склады: бітва ў Канадзе (16+).
**2.45, 3.10, 3.40, 4.04** Бітва скупляе Бруклін (12+).
**4.27, 5.14, 6.01** Махінатары (12+).
**6.48** На драйве з Мішэль Радрыгес (12+).

*У праграме магчымы змяненні. Перадрукоўка праграмы забаронена. [СЦ] – фільм трансліруецца са скрытымі субцітрамі.*

ПАРЛАМЕНЦКІ ДЗЁННІК

# ДЭЦЭНТРАЛІЗАЦЫЯ ПАЎНАМОЦТВАЎ І «АДДАЛЕНЫ КАРЫСТАЛЬНІК»

## Якія яшчэ навацыі чакаюцца ў Кодэксе аб культуры?

**Цяпер у Палаце прадстаўнікоў рыхтуецца да першага чытання законапраект «Аб змяненні законаў па пытаннях культуры». Сенатары таксама далучаюцца да гэтай работы ў якасці экспертаў. Так, планаваныя змяненні абмеркавалі на рабочай нарадзе ў старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктара ЛІСКОВІЧА.**

### На рэгіянальны ўзровень

Жыццё не стаіць на месцы, змяняюцца пэўныя абставіны і акалічнасці, і дзеючы Кодэкс аб культуры таксама патрабуе ўдасканалення з улікам практыкі яго выкарыстання.

Па словах **першага намесніка міністра культуры Валерыя ГРАМАДЫ**, праект закона прадугледжвае ўнясенне змяненняў у Кодэкс па некалькіх кірунках: па пытаннях аховы гісторыка-культурнай спадчыны, увозу і вывазу культурных каштоўнасцяў, арганізацыі і правядзенні культурных мерапрыемстваў і некаторым іншым.

У прыватнасці, па тэме аховы гісторыка-культурнай спадчыны прапануецца вырашэнне пытанняў, якія датычацца нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцяў катэгорыі «3», ажыццяўляць на абласным узроўні, то-бок гаворка ідзе аб дэцэнтралізацыі паўнамоцтваў профільнага міністэрства. Устанаўліваюцца паўнамоцтвы абласных (Мінскага гарадскога) Саветаў па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны, створаных пры аблвыканкамах (Мінгарвыканкаме), на прыняцце некаторых рашэнняў, выдачу заключэнняў у дачыненні да нерухомай матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці трэцяй катэгорыі.

Адначасова некаторыя опцыі, наадварот, цэнтралізуюцца: законапраектам прапануецца замацаваць паўнамоцтва па наданні культурным каштоўнасцям статусу гісторыка-культурных за адным рэгулятарам — Міністэрствам культуры.

### Паслабленні для турыстаў...

Наступны блок змен датычыцца ўвозу і вывазу культурных каштоўнасцяў.

— У мэтах актывізацыі знешняга рознічнага гандлю сучаснымі творамі мастацтва і спрашчэння парадку вывазу культурных каштоўнасцяў, на якія не распаўсюджваецца дзеянне актаў, што складаюць права ЕАЭС, з тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, законапраектам прапануецца замацаваць права юрыдычных і фізічных асоб звяртацца ў Міністэрства культуры ці ўпраўленні культуры аблвыканкамаў (Мінгарвыканкама) або некаторыя арганізацыі культуры для атрымання пісьмовага дазволу аб тым, што заключэнне для вывазу дадзеных культурных каштоўнасцяў не патрабуецца, — растлумачыў прысутным сутнасць новаўвядзенняў Валерый Грамада.

### ...і арганізатараў канцэртаў

Змены чакаюць і нюансы арганізацыі, правядзення культурных мерапрыемстваў. Так, праектам закона прапануецца надаць права ўсім дзяржаўным арганізацыям праводзіць культурна-відовішчныя мерапрыемствы ў краіне без атрымання адмысловых пасведчанняў. Асобна вызначаецца парадак дзеянняў арганізатара культурна-відовішчных мерапрыемстваў у розных выпадках: ад змены часу правядзення да яго



Фота з сайта grodnonews.by

адмены. Вызначаюцца таксама тэрміны вяртання грошай за квіткі: 30 дзён з моманту падачы заявы ў выніку змен ці адмовы ад правядзення мерапрыемства, 60 — у выніку яго адмены.

### Навацыі ад жыцця

Акрамя таго, замацоўваецца практыка стварэння творчыя саюзамі творчых майстэрняў і лабараторый для садзейнічання ажыццяўленню творчай дзейнасці членамі дадзеных саюзаў.

У пытаннях бібліятэчнай справы ў сувязі з развіццём інфармацыйных тэхналогій уводзіцца паняцце «аддаленага карыстальніка», дапаўняюцца спосабы фарміравання страхавога бібліятэчнага фонду такім спосабам як алічбоўка. У музейнай справе ўдакладняецца парадак адкрыцця пастаянных і часовых экспазіцый, тэатры мод становяцца клубнымі фарміраваннямі і гэтак далей.

— Важна, што ўсе гэтыя змяненні прадыктаваныя жыццём і практыкай выкарыстання існуючага заканадаўства, — падкрэсліў Віктар Лісковіч. — Тым больш што ўсе навацыі шырока абмяркоўваліся на рэгіянальным узроўні і, па сутнасці, з'яўляюцца адлюстраваннем жаданняў і патрэб на месцах.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

# ЭФЕКТЫЎНА Ў ПАНДЭМІЮ

## Сенатар Віктар ЛІСКОВІЧ правёў прамую лінію

**Да старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, культуры, навуцы і сацыяльным развіцці звярталіся найбольш па профілі, але былі і «нетэматычныя» пытанні.**

Адразу скажам, што няпрофільных тэм у Савеце Рэспублікі не існуе: нават калі чалавек задае зусім нехарактэрнае для камісіі пытанне, яго перанакіруюць па неабходным адрасе, задзейнічаюць усіх зацікаўленых, возьмуць на абавязковы кантроль і праінфармуюць заяўніка аб зробленых кроках. І няззначных пытанняў тут таксама не бывае: калі нешта турбуе чалавека і ён з гэтым прыходзіць (тэлефануе ці піша) у Савет Рэспублікі — рэакцыя заўсёды будзе! Гарантавана.

Вось і сёння пасля званка выхавацелькі дзіцячага садка аднаго з рэгіёнаў краіны сенатар вырашыў высветліць усе абставіны пачутага па тэлефоне непасрэдна на месцы і, не адкладаючы візіт надоўга, — на наступным тыдні. Віктар Лісковіч разам з заяўніцай «пройдзецца» па спісе агучаных ёю прэтэнзій да кіраўніцтва садка: ад неналежнага вядзення ўліку рабочага часу да несправядлівага размеркавання прэмій сярод супрацоўнікаў.

Званок жыхаркі Брэсцкага рэгіёна нагадаў аб самай актуальнай цяпер праблеме — супрацьдзеянні распаўсюджванню каранавіруснай інфекцыі, у якім павінны быць задзейнічаны ўсе рэсурсы і сродкі. Тамара Мікалаеўна ўзначальвае прыватнае прадпрыемства па вырабе прадукцыі медыцынскага прызначэння, яна не так даўно звярталася ў Савет Рэспублікі з просьбай аб паскарэнні ў афармленні неабходнай дакументацыі. Гэтым разам патэ-



лефанавала старшыні профільнай камісіі, каб расказаць аб зробленых кроках і ўдакладніць алгарытм далейшых дзеянняў.

Як запэўнілі сенатара ў Міністэрстве аховы здароўя, працэс рэгістрацыі ідзе згодна з планам і хутка заяўніца будзе мець усе прававыя падставы для заключэння адпаведных дагавораў з установамі аховы здароўя на закупку яе прадукцыі.

— Тут плануецца выпуск у Брэсцкім рэгіёне медыцынскіх масак, — патлумачыў журналістам сутнасць звароту Віктар Лісковіч. — Прадпрыемства ўжо атрымала дазвол у Цэнтры медыцынскіх экспертыз і ў хуткім часе будзе мець увесь пакет дакументаў, які дазволіць выпускаць медыцынскія маскі высокай якасці і задаволіць попыт на рынку.

Пенсіянер з Кобрына ўзняў асабістае пытанне, якое, як лічыць, можа быць цікавым і для іншых пенсіянераў, і для тых, хто хутка атрымае гэты статус. Уладзімір Львовіч перакананы, што дзеючая сістэма прызначэння пенсіённых выплат па ўзросце мае хібы:

— Прапаную вярнуцца да разліку пенсій без вызначэння ніжняга парога іх налічэння, які з'явіцца 1984 год, — кажа ён.

Сенатар запэўніў заяўніка, што яго прапановы будуць адрасаваны ўраду, а сам ён атрымае вычарпальны адказ у вызначаныя законам тэрміны.

— Нягледзячы на тое, што сёння ў краіне вельмі неспрыяльнае эпідэмічнае становішча, работа са зваротамі грамадзян у Савеце Рэспублікі не спыняецца: людзі могуць даслаць пісьмовы ці электронны зварот, замест асабістага прыёму грамадзян выкарыстоўваем прамыя тэлефонныя лініі, што не пагаршае якасць работы, — растлумачыў Віктар Лісковіч.

Ён адзначыў, што ўзнятыя сёння пытанні стануць нагодай для таго, каб сумесна з зацікаўленымі ведамствамі разабрацца ў іх з выездам на месца:

— Разгледзім, пераканаемся, наколькі яны носяць сістэмны характар, наколькі ўласцівыя іншым установам, і ў залежнасці ад убачанага, будуць фарміравацца далейшыя дзеянні, магчыма, у тым ліку, і ў заканадаўчым плане, — акцэнтуе ўвагу старшыня профільнай камісіі. — Самае галоўнае, каб заяўнікі разумелі, што мы можам вырашаць пытанні ў межах дзеючага заканадаўства, але ў той жа час, калі мы будзем бачыць, што заканадаўства ўжо адстае ад сучаснага жыцця, вядома ж, будзем своечасова рэагаваць на звароты і ўносіць карэктывы ў заканадаўчыя акты, якімі рэгламентуецца жыццё кожнага ў нашай краіне.

**Вольга АНУФРЫЕВА, фота аўтара.**

### У тэму

### На асабістым кантролі — да канчатковага рашэння!

**Зварот па няякасным капітальным рамонце шматкватэрнага дома ў Слонімскім рэгіёне знаходзіцца пад пільнай увагай сенатара. Перад тым як заказчыкі паставяць кропку ў гэтай справе, Віктар Лісковіч выедзе на месца, каб пераканацца, што справаздача — не толькі на паперы.**

Сутнасць справы ў тым, што ў Савет Рэспублікі звярнуліся жыхары аднаго са шматкватэрных дамоў з нараканнямі на якасць праведзенага капітальнага рамонту іх жылля. Тады Віктар Лісковіч выехаў на месца і разам са спецыяльна створанай камісіяй убачыў, што прэтэнзіі людзей не надуманыя. Тады адказны бок запэўніў сенатара, што неабходныя работы на аб'екце будуць даведзены да лагічнага завяршэння ў некалькі этапаў.

— Цяпер работы на аб'екце вядуцца актыўна, і ў лістападзе, як сцвярджаюць заказчыкі, ён будзе здадзены, — расказаў сенатар. — Папярэдне ў канцы кастрычніка мы плануем зноў выехаць на месца і паглядзець, як вядуцца работы, ці ўсё адпавядае графіку.

Ён падкрэсліў: гэта робіцца для таго, каб мець упэўненасць, што пытанне, узнятае жыхарамі дома, будзе вырашана станоўча.

АКЦЫЯ

# Акцэнт — на рабочыя спецыяльнасці

**Намеснік Старшыні Савета Рэспублікі Анатоль ІСАЧАНКА ўзяў удзел у закладцы яблыневага саду ў Мар'інагорскім дзяржаўным ордэна «Знак Пашаны» аграрна-тэхнічным каледжы імя Лабанка, паведамілі ў прэс-службе верхняй палаты парламента.**

Паводле слоў сенатара, мэта акцыі — не толькі ў закладцы новага саду, а яшчэ і ў стварэнні рэальнага навучальнага дапаможніка на зямлі для навучэнцаў каледжа.

— У гэтым садзе прадстаўлены розныя сарты яблынь, дзе падчас вучэбнай практыкі юнакі і дзяўчаты змогуць вывучаць вартасці пладовых дрэў, вызначаць найбольш эфектыўныя спосабы іх вырошчвання, — падкрэсліў Анатоль Ісачанка. Ён таксама звярнуў увагу і на тое, што пладаводства — вельмі перспектыўны напрамак для Беларусі, актыўнае развіццё якога дазволіць цалкам адмовіцца ад імпарту яблыкаў.

Анатоль Ісачанка падзякаваў кіраўніку гаспадаркі «Спартан-Агра», а таксама кіраўніцтву Пухавіцкага раёна за тое, што яны адгукнуліся на прапанову рэалізаваць дадзеную акцыю. Ён удакладніў, што гэта не апошняя яго сустрэча з навучэнцамі Мар'інагорскага аграрна-тэхнічнага каледжа. Для іх мяркуецца арганізаваць шэраг наведванняў буйных айчынных прадпрыемстваў, перадавых гаспадарак і інавацыйных вытворчасцяў, запрасіць у Савет Рэспублікі.

Анатоль Ісачанка перакананы ў тым, што моладзь неабходна арыентаваць на выбар рабочых прафесій, у тым ліку аграрнага профілю. Для гэтага трэба больш актыўна папулярызаваць такія спецыяльнасці. А ўвогуле, на думку намесніка Старшыні Савета Рэспублікі, нефармальныя метады работы з моладдзю — залог выхавання патрыётаў нашай краіны.

# Бульвар 17 Верасня з'явіцца ў сталіцы

**Дакладней, у цэнтры горада: у межах вуліц Кірава, Леніна, Ульянаўскай і стадыёна «Дынама».**

Зразумела, гэта не будзе новая транспартная артэрыя горада. Пакуль канчаткова рашэнне па бульвары 17 Верасня яшчэ не прынята. Цяпер над гэтым пытаннем завяршае ці ўжо завяршыла работу камісія гарвыканкама па называнні і пераназыванні праспектаў, вуліц, плошчаў і іншых складных частак Мінска. У яе, між іншым, уваходзяць і дэпутаты Мінскага гарадскога Савета. Ды і дзейнічае камісія ў адпаведнасці з рашэннем гарадскога Савета дэпутатаў. Члены камісіі ва ўстаноўленым парадку разглядаюць прапановы па новых назвах вуліц сталіцы, пагаджаюцца ці не пагаджаюцца з аўтарамі такіх прапаноў.

Але апошняе слова ў гэтай справе належыць дэпутатам Мінскага гарадскога Савета. Паводле слоў яго **старшыні Андрэя БУГРОВА**, на маючай адбыцца 22 кастрычніка сесіі гарадскога Савета будзе разгледжана пытанне аб пераназыванні аднаго з элементаў транспартнай інфраструктуры горада і наданні ёй назвы «Бульвар 17 Верасня».

Таксама на сесіі вырашаць пытанне і аб прысваенні імя вядомага савецкага пісьменніка, майстра гістарычнай прозы Сцяпана Злобіна праектуемай вуліцы № 4 у межах вуліц М. Лынькова, П. Глебкі і праезда Масюкоўшчына.

Нагадаем, што назва «17 Верасня» далёка не першая ў Беларусі. Вуліцы 17 верасня, у прыватнасці, ёсць у многіх гарадах і населеных пунктах краіны, асабліва ў заходняй частцы Беларусі, якая да 1939 года была ў складзе Польшчы. Напрыклад, недзе 50 гадоў назад новую і самую прыгожую ў райцэнтры Мядзел вуліцу назвалі «17 Верасня». Зроблена гэта было, хутчэй за ўсё, таму, што некалі сучасная тэрыторыя Мядзельскага раёна ўваходзіла ў Заходнюю Беларусь, і мясцовыя жыхары з радасцю і энтузіязмам, як вялікае свята, сустрэлі вызваленне з-пад прыгнёту панскай Польшчы.

З тых часоў вуліцы 17 верасня ўспрымаюцца нашымі суайчыннікамі як сімвал уз'яднання Беларусі.

СПАЖЫВЕЦ

# ФІЛЬТРЫ Ў «МУТНАЙ» ГІСТОРЫІ

## Як з удзелам сенатара вяскоўцам дапамаглі вярнуць грошы

**Тое, што адбылося з некалькімі жыхарамі вёскі Налібокі, што на Навагрудчыне, інакш як махлярствам і не назавеш. Навязлівы маркетынг вымусіў чатырох пажылых людзей набыць фільтры для ачысткі вады па касмічных цэнах. Калі яны зразумелі, што іх банальна ашукалі, гандляроў і след прастыў... Скасаваць дамову і вярнуць грошы дапамог зварот у Савет Рэспублікі.**



«Прашу вашай дапамогі і садзейнічання ў скасаванні дагавора куплі-продажу водаачышчальніка за 250 рублёў», — напісала Тамара Дуброва ў звароце на імя Старшыні Савета Рэспублікі Наталлі Качанавай.

У размове з карэспандэнтам «МС» заяўніца расказала ўсе падрабязнасці таго дня.

— Быў ліпень, абед, я чытала кніжку, калі ў хату пагрукалі. Бачу, прыйшлі дзве жанчыны і мужчына, адна з іх прадставілася работніцай мясцовага водаканала і паведаміла, што будуць устанаўліваць сістэму ачысткі вады. Маўляў, вада ў свідравіне дрэнная, брудная і што неабходна паставіць адмысловыя фільтры, каб карыстацца і піць чыстую. Ставіць будуць усім, таму хваляваца няма чаго, — кажа 78-гадовая гаспадыня.

Яна спытала няпрошаных гасцей, колькі каштуе такая раскоша, у адказ — 500 рублёў. Важная дэталь: пенсіянерка якраз атрымала пенсію.

— Але ж ветэранам працы прадугледжана зніжка ў 50 %, таму атрымаеце за паўцаны, — апавядае далей суразмоўніца. — Пакуль адна запаўняла дагавор, другая распытвала пра жыццё, мужчына ўжо ставіў гэты фільтр. Хвілін пяць усё заняло.

Пенсіянерка толькі і паспела, што аддаць 250 рублёў, атрымаць падпісаны дагавор, як візіцёры пайшлі па вёсцы далей.

— Ведаеце, гэта я цяпер брамку не адчыняю, бо навучаная, а так жа мы прызвычаіліся верыць людзям: электрычнасць, ваду, газ часта прыходзяць правяраць, дакументаў жа мы не пытаем, — разважае пажылая жанчына.

А тады яна, крыху засумняваўшыся ў зробленым, патэлефанавала сынам. Абодва ў адзін голас сказалі: «Мама, ашуканцы!»

Як высветлілася, фільтры прадае індывідуальны прадпрымальнік з Баранавіч і яго наёмныя работнікі. Прычым робяць гэта не першы год. Па дакументах атрымліваецца ўсё чыста: купляе танней, прадае даражэй, ёсць усе паперы... А тое, што купляюць — дык дурняў, маўляў, хапае.

Дарэчы, «МС» ужо пісала раней аб гэтай справе ў матэрыяле «Воднае махлярства»: фільтр замест 90 па 250 рублёў! Як быць старым вяскоўцам?». У вёсцы Налібокі тады клюнулі на гэтую вуду чатыры пенсіянеры — усе з адной вуліцы, суседзі.

Тамара Мікалаеўна расказала, што накіравала пісьмовую прэтэнзію ў адрас прадпрымальніка, звярталася ў мясцовы райвыканкам, нават падавала заяву ў міліцыю. Не тое, што выніку не было, але вырашэнне гэтай праблемы бачылася толькі ў судзе. Тады жанчына і вырашыла: апошняя надзея — ліст у Савет Рэспублікі:

— Я ж тэлевізар гляджу, бачу, як людзям тут дапамагаюць, таму і напісала Наталлі Іванаўне, — прызнаецца суразмоўніца.

Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна Рунец, якой было даручана вывучыць дадзены зварот, правяла ў Баранавіцкім райвыканкаме нараду з удзелам усіх зацікаўленых бакоў: ад сферы гандлю да пракуратуры. Дарэчы, падключэнне апошняй да вырашэння пытання ў рэшце рэшт і паўплывала на яго станоўчае вырашэнне — прадпрымальнік вярнуў людзям грошы добраахвотна.

Фінал заяўніцу не можа не радаваць — яна сама і падманутыя суседзі задаволеныя. Аднак жа пенсіянерка заўважае на развітанне:

— Чула, што яны (гандляры фільтрамі. — **Заўв. аўт.**) былі ў вёсцы Бролькнікі, і там каля 10 чалавек таксама набылі гэтыя фільтры, — кажа Тамара Дуброва. — Ездзяць жа вось так па вёсках і дураць старых людзей...

Яна расказала, што атрымала некалькі лістоў ад праваахоўнікаў, якія інфармавалі яе аб тым, што ў дачыненні да прадпрымальніка праводзілася праверка па прыкметах саставу злачынства «махлярства», але ў апошнім паведамлялася, што яна была прыпыненая. Так што вяскоўцам трэба быць пільнымі: не пускаць чужых, пытаць дакументы ў службовых асоб, калі яны завіталі ў хату, і лішні раз параіцца з блізкімі і роднымі, перш чым спяшацца нешта падпісваць і аддаваць грошы.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

АКТУАЛЬНА

# Маніторынг цэн — у прыярытэце

**Сярод мноства клопатаў дэпутатаў Саветаў усіх узроўняў важнае месца займае рэгулярны маніторынг цэн на прадукты харчавання і лекі.**

У Мінскім гарадскім Савеце народных выбраннікі імкнуцца дзейнічаць у адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў ад 23 лютага 2021 года «Аб часовых мерах па стабілізацыі цэн на сацыяльна значныя тавары першай неабходнасці», мэтай якой з'яўляецца недапушчэнне неабгрунтаванага павышэння цэн на такія тавары.

— Нашы дэпутаты працуюць у цесным кантакце з упраўленнем гандлю Мінскага гарадскога выканкама і прафсаюзнымі арганізацыямі сталіцы, ідзе пастаянны абмен аператыўнай інфармацыяй па цэнах. У выпадку неабходнасці свежыя даныя тэрмінова разглядаюцца, заслухоўваюцца справаздачы адказных асоб, прымаюцца сумесныя меры, — гаворыць **старшыня гарсавета Андрэй БУГРОЎ**.

Да кантролю за цэнамі падключыліся і сенатары. Так, нядаўна на пасяджэнні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах, якую ўзначальвае Таццяна Рунец, абмяркавалі вынікі чарговага штомесячнага маніторынгу цэн на прадукты харчавання і лекавыя прэпараты.

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Марына Ільіна правяла маніторынг цэн у аптэках РУП «Белфармацыя». Сенатар прыйшла да высновы, што ў мінскіх аптэках РУП «Белфармацыя» цэны на 50 найменняў лекавых прэпаратаў захаваны на ўзроўні лютага мінулага года. І пры гэтым насельніцтву на сацыяльна значныя лекавыя сродкі яшчэ прадастаўляецца 10-працэнтная зніжка.

Адзначым, што маніторынг цэн у сталіцы на прадукты харчавання і лекі будзе працягнуты.

**Мікалай ЛЮБЧАНСКІ.**


МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ АЛЯКСАНДР МІКАЛАЕВІЧ.

Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;

e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 14.804. Нумар падпісаны ў 19.30 21 кастрычніка 2021 года.

Вандроўка патрыёта

# ГІСТОРЫІ СЛАЎГАРАДСКАГА НЕКРОПАЛЯ

## Могілкі старадаўняга Прапошаска могуць стаць дадатковым турыстычным маршрутам для паломнікаў Блакітнай крыніцы

**Слаўгарад не Львоў з яго могілкамі-музеем, дзе можна хадзіць паўдня, адкрыўшы рот, пад уздзеяннем гучных імён, помнікаў і эпітафій. Там ёсць і прафесійныя экскурсаводы, і спецыяльна распрацаваны маршрут. Туды едуць спецыяльна па эмоцыі. У Слаўгарадзе ўсё інакш. Замест экскурсавода — супрацоўнік «Жылкамгаса», ды і маршруту канкрэтнага няма — хутчэй гэткі экспромт. Але асабіста мне спадабалася. Тут і старадаўнія пахаванні, і вядомыя імёны, і гід з веданнем справы.**

Уладзімір Карасцялёў працуе ў Слаўгарадскім «Жылкамгасе» наглядчыкам могілак. Кажучы простай мовай, займаецца арганізацыяй пахаванняў: ад выдзялення месца да аказання дапамогі з копкай магілы і ўсталяваннем надмагілля. Ён жа адказвае за парадак на могілках. У райцэнтры іх, дарэчы, тры. У прафесіі Уладзіміра нічога незвычайнага няма, уся асаблівасць у тым, як ён падыходзіць да сваёй справы.

Слаўгарадскаму «Жылкамгасу» наогул шчасціць з аматарамі гісторыі. Дзякуючы ім у старадаўнім парку на беразе ракі Сож ажыла некалькі старонак далёкага мінулага, калі тут былі замак, млын, абарончы вал. Зроблена ўсё гэта за кошт грантаў пад адмысловыя праекты, якія пісалі спецыялісты прадпрыемства. Тайны слаўгарадскага некропаля не менш цікавыя.

— Не страшна па могілках хадзіць? — на ўсялякі выпадак цікавіцца гід. — Гэта ж іншая рэальнасць. Не для слабанервовых.

Экскурсію пачынаем з вуліцы Чырвонаармейскай. Там, дзе пахаваны вядомы мастак Фёдар Тулаў — той самы, чые работы знаходзяцца ў самых знакамітых музейных калекцыях: Траццякоўскай галерэі, Рускім музеі і Эрмітажы ў Санкт-Пецярбургу, у Смаленскім, Калужскім, Адэскім музеях. У старадаўнім Прапойску ён жыў з 1830 года ў маёнтку Аляксандра Іванавіча Бенкендорфа — стрыечнага брата вядомага графа Аляксандра Хрыстафоравіча Бенкендорфа. Фёдар Тулаў, акрамя мастацтва, захапляўся яшчэ механікай і астраноміяй. У маёнтку, кажуць, была невялічкая абсерваторыя, адкуль таленавіты партрэтыст назіраў за зоркамі разам з гаспадаром дома.

— Тулаў памёр, калі яму было ўсяго 63 гады. Спачатку ён быў прыгонным, але Бенкендорф даў яму вольную, — удакладняе мой гід і кліча далей.

На пліце, якая датавана 1850 годам, пазначана, што пад ёй ляжыць васьмігадовая Марыя, дачка Міхайлы Якаўлевіча Карабцава, мясцовага памешчыка. Калісьці на краі слаўгарадскага парка быў шыкоўны сад гэтага заможнага сямейства.

— Пліта вельмі добра захавалася, — адзначае Уладзімір. — Я наогул адсочваю пільна, каб старадаўнія надмагіллі не зніклі. Была спроба вывезці пліту мастака Тулава, але своечасова спахапіліся.

Звяртаю ўвагу на велізарны — метры тры ў вышыню — крыж з граніту. Належыць Вользе і Сяргею Маргуновым, якія памерлі з розніцай у тры гады — у 1969-м і 1972-м. Крыж уражвае памерамі, але знаўца тутэйшага некропаля абмяжоўваецца каментарыем: стаіць ужо даўно. І мы ідзём далей. Месцамі ледзь праціскаемся паміж агароджамі.

— Раней наогул кожны як хацеў, так і хаваў, — уздыхае наглядчык і строга дадае, што з нядаўняга часу гэта рэгулюецца.

Праходзім міма помніка, з якога глядзіць яшчэ даволі маладжавы твар.

— Гэта Андрэй, мой сусед, — кідае на хаду суразмоўнік. — Быў дэканам універсітэта ў Магілёве. Бачыў яго жывым і здаровым, а літаральна праз дзень даведаўся, што ён памёр.

— А вось Міхаіл Граншчыкаў, — прыпыняемся каля чарговага помніка. — Быў у Слаўгарадзе даволі багаты калгас — «Кастрычнік». Я школьнікам там кожнае



